Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КАСТРЫЧНІК 4 1933 г. СЕРАДА № 219 (4763)

Год выдання XVII

Камандору аўтапрабега Масква—Кара-Кум—Масква— МІРЭЦКАМУ, сакратару парткалектыва калоны— БЕНЕВАЛЕНСКАМУ, старшыні тэхнічнай камісіі— ЭХТУ

Горача вітаем майстроў гістарычнага аўтапрабега. Сваёй упартай і гераічнай работай удзельнікі аўтапрабега даказалі высокую якасць совецкіх вадзіцеляў, стандартных совецкіх аўтамашын і пакрышак, праклалі новыя шляхі совецкаму аўтамабілю.

Уваходзім у ЦВК Саюза ССР з хадайніцтвам аб узнагароджанні ордэнам Леніна удзельнікаў аўтапрабега, як бліскуча выканаўшых важнае заданне совецкай улады.

СТАЛІН, МОЛАТАЎ, ВАРАШЫЛАЎ, КАГАНОВІЧ

Пілотам ... краін, ... „СССР“ —ПРАКОФ'ЕВУ, Камандзіру стратастата пілоту—БІРНБАУМУ інжынеру—ГАДУНОВУ

Вітаем непераўзыдзеных герояў стратасферы з бліскучым выкананнем задання совецкай улады.

Вы, сумесна з рабочымі і канструктарамі, стварыўшымі стратастат, разам з арганізатарамі палёта ўпісалі бліскучыя старонкі ў гісторыю совецкай авіяцыі і вывучэння стратасферы. Ваша самаадданая і паспяховая работа яшчэ выявіла новыя дасягненні совецкай тэхнікі.

Мы ўваходзім у ЦВК Саюза ССР з прапановай аб узнагароджанні ордэнам Леніна ўдзельнікаў і арганізатараў палёта.

СТАЛІН, МОЛАТАЎ, ВАРАШЫЛАЎ, КАГАНОВІЧ

ВЫКАНАЕМ СВОЙ АБАВЯЗАК ПЕРАД ПРОЛЕТАРЫЯМІ ЛЕНІНГРАДА

Замест звычайных 120-144 гадзін, маршрутны цягнік імя „Звязды“ прашоў шлях ад Оршы да Ленінграда за 42 гадз. 30 м.

ГЭТЫ ВОПЫТ ДАКАЗВАЕ ПОЎНУЮ МАГЧЫМАСЦЬ ЗНАЧНАГА СКАРАЧЭННЯ ТЭРМІНАЎ ПРАХАДЖЭННЯ ЦЯГНІКОЎ І ПАВЯЛІЧЭННЯ АБАРАЧВАЕМАСЦІ ВАГОННАГА ПАРКУ

БАЯВАЯ ЗАДАЧА ЧЫГУНКІ—АДПРАЎЛЯЦЬ СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ МАРШІРУТЫ З БУЛЬБАЙ, ВЫКАНАЦЬ ПЛАНЫ АДГРУЗКІ Ў ВЫЗНАЧАНЫЯ ТЭРМІНЫ

ЗАВЯРШЫМ У ТЭРМІН АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ і ГАРОДНІНЫ

На 7-га кастрычніка 1932 года адгружана Ленінграду **36.112 тон** — 22 проц. задання. На 2-га кастрычніка 1933 года адпраўлена **74.063 тоны**—27,4 проц. гадавога плана.

Параўнанне гэтых лічбаў гаворыць аб многім. Яно ярка сведчыць аб значным **павышэнні тэмпаў** здачы бульбы ў параўнанні з мінулым годам. Яно гаворыць аб значна лепшай арганізацыі паставак у гэтым годзе. Гэтыя поспехі—вынік няўхільнага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў і перамог новых форм партыйна-масавай работы на вёсцы, вынік непасрэднага большэвіцкага кіраўніцтва з боку ЦК КП(б)Б.

Аднак, цяперашнія тэмпы адгрузкі бульбы нас ні ў якім разе задаволіць не могуць. Трэба ўлічваць, што тэрміны адгрузкі ў гэтым годзе вельмі сціснуты. Адпраўку бульбы Ленінграду трэба скончыць не пазней **25-га кастрычніка.** А як было летась? Зацягнулі кампанію да замаразкаў, не падрыхтавалі ватонны парк да зімы і паставілі прадукцыю пад пагрозу псавання. Сёлета мы гэтага дапусціць не можам. У нас ёсць усе ўмовы для таго, каб **скончыць адгрузку ў вызначаны партыяй і ўрадам тэрмін.**

Для гэтага патрэбна перш за ўсё ўдарная баявая работа ўсіх арганізацый, у першую чаргу, **чыгункі і загатоўшчыкаў.** Аднак, работа чыгункі выклікае законную трывогу. Чыгунка выключна дрэнна абслугоўвае важнейшую гаспадарча-палітычную кампанію. Яна свячасова не падрыхтавалася да асення-зімовых перавозак, не правяла патрэбнай гібкасці і манеўраздольнасці, каб справіцца з напружаным планам.

Можна проста сказаць, чыгунка ў гэтым годзе **лімітуе тэмпы адгрузкі.** Дрэнная работа пагаршае снабжэнне ленінградскіх рабочых.

У «Звязду» штодзённа паступаюць з розных пунктаў тэлеграмы аб пагражаючым становішчы з адгрузкай. На станцыях, прыстанях скапілася дзесяткі тысяч тон бульбы, якая не вывозіцца з-за адсутнасці вагонаў. На станцыях Слуцак, Рагачоў, Бабруйск, Гомель, Верайцы і інш. залежы прадукцыі растуць. Больш таго, стварыліся нават заторы на пераваленных пунктах, куды чыгунка павінна ў першую чаргу падаваць вагоны. Сотні тон ляжаць у неразгружаных баржах, бо чыгунка не падае вагонаў. Гэта дэзарганізуе работу рачнога транспарта і выклікае лішнія прастоі суднаў.

Чыгуначныя арганізацыі знаходзяць аб'ектыўныя прычыны, каб апраўдаць непадачу вагонаў: «няма паражняка».

Ці правільна гэта апраўданне? Не. Яно не вытрымлівае крытыкі. Бюракратычная непаваротлівасць, перухомасць, няўменне і нежаданне пераключыць максімум увагі на ажыццяўленне важнейшай задачы, мабілізаваць усе наяўныя рэсурсы—вось прычына дрэннай работы транспарта.

Яшчэ не ліквідаваны сустрэчныя перавозкі (Слуцак-Асіпавічы). Ёсць рад выпадкаў перагона парожніх вагонаў (Рагачоў, Слуцак). Мы маем рад фактаў, калі адгрузка затрымліваецца з-за падачы зусім непрыгодных вагонаў. На станцыі Лепель падалі пульманаўскі вагон без люка, вагон з-пад газы. У Астапковічах Віцебскага раёна, падалі пад бульбу два вагоны з-пад цэмента. На станцыі Бурбіна прыслалі вагон з-пад гашанай ...ы. Такую работу інакш як шкодніцтвам кваліфікаваць нельга: насыпаць бульбу ў забруджаных вагонах—значыць загадзя асудзіць яе на псаванне.

Замест таго, каб мабілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы чыгуначныя арганізацыі ідуць па лініі найменшага супраціўлення. На нарадзе пры кіраўніцтве ўпаўнаважанага камэта СНК представнік НКШЗ тав. **Хрыстафораў** даказваўся да таго, што прапанаваў зменшыць тэмпы адгрузкі. Кіраўніцтва Жлобінскага чыгуначнага раёна прапанавала станцыям не прымаць заявак ад загатоўшчыкаў. Такія бездапаказныя адносіны да важнейшага задання ні ў якім разе недапушчальны.

Аб тым, што чыгунка мае поўную магчымасць павялічыць абарот вагонаў, сведчыць вопыт маршрутнага цягніка імя «Звязды». Улічваючы вопыт дыспетчэра Паўночна-Каўказкай дарогі Кі...ва, «Звязда» разам ... праца» на ... прадсці спе... ...ай у Ленін... ...рэмін. Мар...шрутны цягнік з 60 вагонаў з 1.300 тонамі бульбы адправіўся са станцыі Орша 1 кастрычніка а 7 гадз. 30 мін. раніцы. Яго суправаджала скразная комсамольская брыгада. Цягнік прыбыў у Ленінград 3-га кастрычніка а 1 г. 30 мін. Такім чынам тэрмін пра соўвання маршрута скарочан амаль у два-тры разы на 2-3 сутак раней звычайнага. Значна скарочан час знаходжання вагонаў у дарозе, павялічан абарот вагоннага парка. Трэба ўсямерна пашырыць гэты вопыт. **Чыгунка павінна паставіць перад сабой задачу—адпраўляць бульбу маршрутамі.**

Чаму нельга арганізаваць курсаванне паміж БССР і Ленінградам **пастаянных бульбяных эшалонаў, так званых вяртушак.** Гэта значна павялічыла-б рэсурсы чыгункі. Гэта пытанне зусім правільна і своячасова паставіла ў гутарцы з нашым супрацоўнікам упаўнаважаны Совета Праны і Абароны тав. **Шапашнікава.**

Чыгуначныя арганізацыі павінны раз назаўсёды адмовіцца ад чыноўніцка-фармальных адносін да справы, праявіць максімум ініцыятывы, гібкасці і выразнасці, каб ажыццявіць адказнейшыя задачы, пастаўленыя перад транспартам.

Вялікае значэнне набывае выразная работа прыёчных пунктаў. Загатоўчыя арганізацыі павінны наладзіць бесперабойную прыёмку і абсугоўванне здатчыкаў. З рада месц сігналізуюць, што загатоўчы апарат не спраўляецца са сваімі абавязкамі: не ліквідаваны чаргі на пунктах, не арганізаваны чайныя і ларкі, ёсць выпадкі прыёмкі гнілой засмечанай бульбы, ашуквання і абважвання калгаснікаў і аднаасобнікаў. Дзе-ні-дзе на прыёмку прадзелі варожыя людзі, якія імкнуцца сарваць настаўкі (Полацак, Шклоў). Трэба ачысціць прыёмачны апарат ад варожых элементаў, забяспечыць яго максімальную працаздольнасць.

Чыгуначныя і загатоўчыя арганізацыі нясуць поўную адказнасць за захаванне бульбы на станцыях і ў пуці. Іх задача—праверыць становішча бульбы на станцыях і прыстанях, падрыхтаваць салому, фанеру, дошкі, пабудаваць навесы лёгкага тыпа, арганізаваць пільную ахову, каб забяспечыць поўнае захаванне прадукцыі.

Абавязковыя пастаўкі бульбы і адгрузка Ленінграду—першачарговы абавязак усіх пашых арганізацый. Таму мы павінны рашуча змагацца са спробамі парушэння закона, з месніцкімі, рваніцкімі тэндэнцыямі. Наш баб'руйскі карэспандэнт паведамляе аб спробах некаторых раённых арганізацый—РВК, пракуратуры, прамарцеляй—атрымаць бульбу ў парадку дэц загатовак з калгасаў для сваіх патрэб. Гэтым спробам трэба даць рэзкі адпор.

Заторы, якія стварыліся на станцыях, ні ў якім разе не знімаюць ад казнасці з загатоўчых і земельных арганізацый за **поўнае і своячасовае выкананне планаў уборкі і паставак бульбы.** Іх абавязак—забяспечыць бесперабойную дастаўку адсартаванай добраякаснай бульбы з поля на прыёмачныя пункты. **Нельга дапусціць ні малейшага зацягвання ўборкі.** Трэба разбіць усякія спробы варожых элементаў сарваць уборку, да канца выкрыць кулацкую агітацыю, быццам можна не спяшацца з капаннем, паколькі па пунктах накапілася шмат бульбы. Людзі, якія зацягваюць капанне, дапамагаюць гэтым манеўрам класавага ворага.

Усямерна ўзмацняючы тэмпы паставак і адгрузкі бульбы, мы не павінны ігнараваць задачы **загатовак і адгрузкі гародніны** Ленінграду. Адгрузка гародніны ідзе вельмі дрэнна. На 25 верасня гадавы план выкананы толькі на 20 проц. Асабліва дрэнна ідзе загатоўка і адпраўка гуркоў і цыбулі (13,5 проц.).

Такое становішча, як адзначаюць ЦК і СНК у сваёй пастанове, з'яўляецца вынікам яўнай недаацэнкі гэтай справы, поўнага ігнаравання важнейшага задання з боку Белкаапсаюза і Белплодагародніны, зусім слабай барацьбы з месніцкімі і антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі. Партыя і ўрад паставілі перад усімі арганізацыямі баявую задачу—абавязкова скончыць адгрузку гародніны Ленінграду не пазней 20 кастрычніка.

Лаб'ем поўнага ажыццяўлення ... ...ку на адгрузцы бульбы і гародніны ў вызначаныя тэрміны! Выканаем з гонарам свой абавязак перад пролетарыямі горада Леніна!

ДЗЕННІК МАРШРУТА ІМЯ „ЗВЯЗДЫ“

ОРША.

1 кастрычніка, недзь толькі пачало світаць, дзяжурны дыспетчэр РОЛЕЎ аддаў распараджэнне фармаваць маршрут з бульбой Ленінграду. Работа працякала ўдарна, з вялікім уздымам. Роўна ў вызначаны час начальнік станцыі МАКАВІЦІС даў сігнал адпраўлення. «Правесці цягнік у Ленінград у найкарацейшы час» — з такім лозунгам накіраваліся ў дарогу.

Кандуктарскія комсамольскія брыгады Буса і Масальскага заключылі соцыялістычныя дагаворы на лепшае выкананне абавязацельстваў.

МАЖЭЙКА.

Не паспелі праехаць і 10 клм., як сутыкнуліся з першымі адзнакамі разгільдзяйства. Дзяжурны па станцыі Мажэйка ОСІПАЎ затрымаў прыняцце цягніка і імкнуўся абвінаваціць у гэтым стрэлачніка. Осіпаў ужо мае спагнанні за падобныя праступкі ў мінулым. Дыспетчэр тав. КРЭСІК паведаміў аб гэтым кіраўніцтва раёна для прыцягнення Осіпава да адказнасці за затрыманне цягніка.

БАГУШЭЎСКАЯ

Добра ўсвядоміўшы ўсё значэнне задач, пастаўленых перад намі, паравозная брыгада БОГАПРЫМЦАВА бярэцца нагнаць упушчанае. Аднак, каля Багушэўскай зноў вымушанае затрыманне. Гараць буксы вагона 608172, зламалася рэсора. Прычына гарэння — неадпаведнасць падшыпніка восевай шэйцы па віне пункта абмена. На працягу 10 мінут адчапілі вагон. Едзем далей. Затрымлівае нас ідучы наперадзе цягнік. У Багушэўскай чакае паправаны тэлефонам тэхнічны агент. Змена рэсор працягваецца 8 мінут.

ЗАМАСТОЧЧА

Станцыя затрымала цягнік на 25 мінут. Апераджаем маршрутны № 7341. Ставім баявую задачу — кампенсаваць вымушаныя затрыманні шляхам скарачэння стаянкі ў Віцебску.

ВІЦЕБСК

У выніку распараджальнасці дзяжурнага дыспетчэра пасюран тэхнічны агляд цягніка. Дагружан састаў яшчэ на 20 тон на працягу 30 мінут. Стаянка скарочана — замест 1½ гадзіны стаім 35 мінут. Апераджаем цягнік 6401.

ЕЗЯРЫШЧА

На станцыі Езярышча дзяжурны па станцыі ГАРБАЧОЎ незаконна заняў пуць цягнікам, які парушыў графік, і затрымаў нас на 25 мінут. На працягу трох год пад апекай сваякоў — начальніка станцыі КАДАСОЎЦАВА і работнікаў кіраўніцтва Віцебскага раёна —гэты чыноўнік беспакарана робіць злачынствы.

Ля Невеля апераджаем цягнік, які затармазіў нам пуць.

Не гледзячы на рад вымушаных затрыманняў у дарозе, у Нова-Сакольні прыбылі своячасова, па графіку.

Ноччу мелі астаноўкі з-за сустрэчных цягнікоў. Уступілі ў самы адказны этап — аднакалейны пуць. На станцыі Сушава затрымаў тэхнічны агляд па віне агента САВЕЛЬЕВА. На станцыю Дно прыбылі, спазніўшыся на 2 гадзіны. Змагаемся за скарачэнне стаянак, за прыход у Ленінград за 2 сутак замест звычайных 4-5.

Брыгада «Звязды»: ДОДЗІН, МЯДЗВЕДЗЕЎ.

ЦЯГНІК ПРЫБЫЎ У ЛЕНІНГРАД

ЛЕНІНГРАД. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

НЕ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ПАПЯРЭДЖАННЕ СТАНЦЫІ **ДНО** ЗА ДЗЕНЬ РАНЕЙ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ПРЫЁМКІ І ЗАБЕСПЯЧЭННІ ХУТЧЭЙШАГА АДПРАЎЛЕННЯ МАРШРУТНАГА ЦЯГНІКА ІМЯ «ЗВЯЗДЫ», ПАМОЧНІК НАЧАЛЬНІКА СТАНЦЫІ **ШЫРАЕЎ** НЕ ПЕРАДАЎ ПАПЯРЭДЖАННЯ ДЗЯЖУРНАМУ КАНЦЭВІЧУ.

АПОШНІ АДКЛАЎ АДПРАЎКУ ЦЯГНІКА ДА 17 ГАДЗІН. НА СТАНЦЫІ —ГАНЕБНЫЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ. СТВАРЫЛАСЯ «ПРОБКА». ТРЫ МАРШРУТНЫЯ ЦЯГНІКІ СТАЯЦЬ ДЗЕСЯТКІ ГАДЗІН. ВЕЛЬМІ ПАВОЛНА ІДЗЕ ІХ АГЛЯД. ЗАТРЫМАН ЦЯГНІК, ВЫЗНАЧАНЫ ДЛЯ АДПРАЎЛЕННЯ РАНЕЙ НАШАГА, У СУВЯЗІ З НЕСКАНЧЭННЕМ РАМОНТА. РАСХЛЯБА НАСЬЦЬ, ЯКАЯ ПАНУЕ НА СТАНЦЫІ, ЛЕПШ ЗА ЎСЁ ХАРАКТАРЫЗУЕЦЦА АДСУТНАСЦЮ Ў ДЗЯЖУРНАГА НА СТАНЦЫІ ГРАФІКА РУХУ ЦЯГНІКОЎ.

НАША БРЫГАДА ПРЫНЯЛА РАД МЕР, КАБ СКАРАЦІЦЬ СТАЯНКУ. ПАПЯРЭДЖАНЫ ТЭЛЕФОНАМ ТЭХНІЧНЫ АГЕНТ. ЗМЕНА РЭСОР ПРАЦЯГВАЕЦЦА 8 МІНУТ.

ЗАМАСТОЧЧА

Станцыя затрымала цягнік на 25 мінут. Апераджаем маршрутны № 7341. Ставім баявую задачу — кампенсаваць вымушаныя затрыманні шляхам скарачэння стаянкі ў Віцебску.

ВІЦЕБСК

У выніку распараджальнасці дзяжурнага дыспетчэра пасюран тэхнічны агляд цягніка. Дагружан састаў яшчэ на 20 тон на працягу 30 мінут. Стаянка скарочана — замест 1½ гадзіны стаім 35 мінут. Апераджаем цягнік 6401.

ЕЗЯРЫШЧА

На станцыі Езярышча дзяжурны па станцыі ГАРБАЧОЎ незаконна заняў пуць цягнікам, які парушыў графік, і затрымаў нас на 25 мінут. На працягу трох год пад апекай сваякоў — начальніка станцыі КАДАСОЎЦАВА і работнікаў кіраўніцтва Віцебскага раёна —гэты чыноўнік беспакарана робіць злачынствы.

Ля Невеля апераджаем цягнік, які затармазіў нам пуць.

Не гледзячы на рад вымушаных затрыманняў у дарозе, у Нова-Сакольні прыбылі своячасова, па графіку.

Ноччу мелі астаноўкі з-за сустрэчных цягнікоў. Уступілі ў самы адказны этап — аднакалейны пуць. На станцыі Сушава затрымаў тэхнічны агляд па віне агента САВЕЛЬЕВА. На станцыю Дно прыбылі, спазніўшыся на 2 гадзіны. Змагаемся за скарачэнне стаянак, за прыход у Ленінград за 2 сутак замест звычайных 4-5.

Брыгада «Звязды»: ДОДЗІН, МЯДЗВЕДЗЕЎ.

Справа гонару ўсіх чыгуначнікаў БССР

Упаўнаважаны совета працы і абароны на адгрузцы гародніны і бульбы Ленінграду т. **Шапашнікава** ў гутарцы з нашым супрацоўнікам ахарактарызавала задачы, што стаяць перад транспартам БССР.

— На сёпешні дзень загатоўлена для Ленінграда 115 тыс. тон бульбы, адгружана 65 тыс. тон. Бульба ляжыць на станцыях. Асабліва напружанае становішча ў Жлобінскім раёне, Гомелі, Крычаве і на пераваленых пунктах.

1-га кастрычніка з Беларусі адпраўлена ў Ленінград 481 вагон. Сёння такія тэмпы нас задаволіць не могуць. Для таго, каб поўнасцю выканаць план адгрузкі, неабходна ў бліжэйшыя тры-чатыры дні разгрузіць станцыі ад бульбы. Патрабуецца ў сярэднім у першую пяцідзённку кастрычніка 4.300 вагонаў. Гэта дазволіць ужо ў наступную пяцідзённку, ўлічваючы ўзмоцнены падвоз бульбы, разгрузіць станцыі пры падачы штодзённа 600 вагонаў.

У трэцюю і чацвертую пяцідзённкі патрабуецца ў сярэднім па 500 вагонаў і ў пятай пяцідзённцы не больш 250-300 вагонаў, калі нават улічыць вывазку ўсіх астаткаў, якія будуць на чыгуначных станцыях БССР.

Гэта ставіць перад усімі чыгуначнымі арганізацыямі задачу — неадкладна, па-баявому перабудаваць сваю работу, своячасова выўлічыць і падаваць на пункты неабходную колькасць вагонаў.

Трэба наладзіць своячасовы ўлік усяго паражняка, які знаходзіцца ў Беларусі, мабілізаваць унутраныя рэсурсы, каб па дарогах не было прастою вагонаў.

РВК, комсамольскія арганізацыі, загатоўшчыкі абавязаны арганізаваць бесперабойную нагрузку вагонаў, не дапусціць прастоя іх, мабілізаваць грамадскасць і здатчыкаў на выкананне планаў адгрузкі.

Чыгуначныя арганізацыі, пад кіраўніцтвам палітаддзелаў, комсамол павінны рашуча змагацца за захаванасць гародніны і бульбы на станцыях, сачыць за тым, каб яна не была пакладзена вельмі высока — не больш паўтары метраў, каб на мясцох была салома, фанера для прыкрыцця бульбы напач. Днём у добрую сонечную пагоду трэба абавязкова рассыпаць бульбу, каб зберагчы яе ад гарэння. Трэба арганізаваць ахову прадукцыі на станцыях.

Наша задача не толькі адгрузіць бульбу Ленінграду ў тэрмін, але забяспечыць яе высокую якасць.

Тое, што мы вывозім зараз з БССР, паслужыць для Ленінграда гадавой гародняй базай. І справа гонару ўсіх арганізацый БССР і калгасаў — гэту базу забяспечыць.

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і СНК за апошні час на мясцох разгорнута вялікая практычная работа па своячасовым выкананні планаў загатовак гародніны і бульбы для Ленінграда. Мы маем ужо станоўчыя вынікі.

Лозунг сёпешняга дня — завяршыць пачатую работу і наладзіць бесперабойную адгрузку Ленінграду бульбы і гародніны.

Ход адгрузкі бульбы Ленінграду

(На 2 кастрычніка ў тонах)

Назва арганізацыі	Гадавы план	Адгружана		Процант
		За дзень	З пачатку кампаніі	
Белкаапгародніна . . .	157.270	3.120	45.875	29,2
Белплодагародніна . .	113.000	1.007	28.188	24,9
РАЗАМ: . . .	270.270	4.127	74.063	27,4
Выкананне мінулага дня	202.930			2,0

АБ ХОДЗЕ ЗАГАТОЎКІ І АДГРУЗКІ ГАРОДНІНЫ ЛЕНІНГРАДУ

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР

ЦК і СНК устанаўляюць, што загатоўка і адгрузка гародніны Ленінграду праходзіць выключна дрэнна (на 25-IX — 33 г. гадавы план адгрузкі гародніны выкананы на 20 проц., прычым асабліва дрэнна праходзіць загатоўка і адгрузка гуркоў — адгружана 37 проц., цыбулі адгружана 13,5 проц.).

Такое становішча загатоўкі і адгрузкі гародніны Ленінграду з'яўляецца вынікам яўнай недаацэнкі значэння гэтага пытання, адсутнасці канкрэтнай работы і поўнага ігнаравання гэтага важнейшага задання з боку Белкаапсаюза (т. т. Царонка і Зелічонка), Белплодагародніны (т. Анікейчыка), а таксама ў выніку аусім слабай увагі і адсутнасці канкрэтнага кіраўніцтва гэтай справай з боку РК і РВК.

З боку ўпаўкамзак СНК (Красоўскі) няма да гэтага часу належнага канкрэтнага аперацыйнага кіраўніцтва справай загатоўкі і вывазкі гародніны.

ЦК і СНК падкрэсліваюць, што адной з прычын такога становішча загатоўкі і адгрузкі Ленінграду асабліва па такіх прадуктах, як гуркі і цыбуля, план якіх у жніўні — верасні фактычна сарваны, з'яўляецца праўленне месніцкіх, антыдзяржаўных тэндэнцый з боку паасобных загатоўшчыкаў, саўгасаў і калгасаў, з якімі (тэндэнцыямі) мясцовыя партыйныя і совецкія органы не вядуць рашучай барацьбы, а месцамі фактычна патураюць гэтаму.

ЦК і СНК пастанаўляюць:

1. Зацвердзіць прадстаўлены ўпаўкам зак СНК аперацыйны план адгрузкі гародніны Ленінграду па пяцідзённках, які прадугледжвае сканчэнне ўсёй адгрузкі да 20-га кастрычніка, у наступных размерах:

у тонах:

	Белплодагародніна	Белкаапплодагародніна
Капусты	2.725	3.860
Гуркоў	800	2.997
Кораньплодаў	318	2.180
Цыбулі	100	73

2. Прапанаваць упаўкамзак СНК да поўнага выканання плана адгрузкі гародніны Ленінграду пераключыць усе раёны незалежна ад іх прымацавання, на загатоўку і адгрузку гародніны Ленінграду і спыніць усялякае выкананне ўнутрырэспубліканскіх нарадаў іншым загатоўшчыкам.

3. Ускласці персанальную адказнасць за выкананне плана загатоўкі і адгрузкі гародніны Ленінграду на ўпаўкамзак СНК тав. Красоўскага, па Белкаапсаюзу т. Царонка і па Белплодагародніне на т.. Анікейчыка, прапанаваўшы ім а) у цэнтральных апаратах выдзеліць спецыяльную групу работнікаў для гэтай мэты, устанавіўшы аперацыйнае канкрэтнае кіраўніцтва кожным раёнам; б) у раёнах пераключыць работу дырэктароў, райзагаў і загадчыкаў кантор Белплодагародніны выключна на загатоўку і адгрузку гародніны і бульбы Ленінграду, вызваліўшы іх ад усялякіх іншых работ на час выканання імі задання па загатоўках і адгрузцы.

4. Для штодзённага нагляда і дапамогі ў выкананні плана загатоўкі і адгрузкі Ленінграду: а) прымацаваць да Белплодагародніны т. Пыжыкава і да Белкаапгародніны т. Дзэнісевіча; б) у раёнах — прапанаваць райкомам і райвыканкомам вылучыць аднаго з членаў бюро РК вызваліўшы яго ад усялякіх іншых работ, паведаміўшы тэлеграфна ЦК т. Рыскіну прозвішчы вылучаных таварышоў.

5. Абавязаць РК і РВК неадкладна выдзеліць у калгасах і саўгасах, якія ідзюць дзяржаве гародніну, неабходную колькасць рабочых брыгад і цягавай сілы спецыяльна для ўборкі і вывазкі гародніны да прыёмачных пунктаў, не чапаючы ударнікаў у калгасе і саўгасе.

Абавязаць райкомы разгледзець спецыяльна пытанні аб уборцы і вывазцы гародніны ў саўгасах, намеціўшы канкрэтныя меры, якія, забяспечваюць першачарговасць загатоўкі і вывазкі саўгасамі да прыёмачных пунктаў, устаноўленых для іх планаў здачы дзяржаве гародніны.

6. Даручыць т. т. Красоўскаму, Раскіну з удзелам Шапашнікавай устанавіць парадак па дачы і скарыстання вагонаў спецыяльна для адгрузкі гародніны (цыбулі, буракоў, капусты і кораньплодаў) Ленінграду, даўшы адпаведнае паказанне раёнам па гэтых пытаннях.

7. Абавязаць РК і РВК устанавіць нагляд за правільнасцю скарыстання вагонаў, якія падаюцца спецыяльна для адгрузкі гародніны, сурова прыцягваючы да адказнасці вінаватых у несвячасовым скарыстанні вагонаў, аказваючы дапамогу загатоўшчыкам у мабілізацыі неабходнай рабсілы для бесперабойнай загрузкі вагонаў.

Папярэдзіць старшынь РВК, што ў выпадку несвячасовай разгрузкі вагонаў яны нясуць за гэта персанальную самую суровую адказнасць.

8. У сувязі з выключна дрэнным ходам выканання плана загатоўкі і адгрузкі цыбулі і гуркоў і што пры выкананні гэтых планаў з боку загатоўчых і мясцовых органаў праўляюцца месніцкія, антыдзяржаўныя тэндэнцыі, — папярэдзіць загатоўчыя арганізацыі, РК і РВК, што выкананне устаноўленых планаў і па гэтых прадуктах з'яўляецца для іх абавязковым пры ўсялякіх умовах.

Абавязаць РК спецыяльна разгледзець пытанні аб ходзе выканання плана загатоўкі і адгрузкі ў першую чаргу Ленінграду цыбулю і гуркоў, прыняўшы меры да поўнага выканання ўстаноўленых для іх планаў, у прыватнасці:

а) шляхам неадкладнай адгрузкі Ленінграду ўсёй наяўнай колькасці цыбулі і гуркоў ў загатоўчых арганізацый;

б) дабіцца выканання як заключаных кантрактацыйных дагавораў, так і дадатковай загатоўкі засоленых гуркоў і памідор з ліку устаноўленага для асабістага спажывання шляхам правядзення спецыяльнай работы па гэтаму пытанню ў калгасах, сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў; в) камандыраваць у найбольш рашаючыя пункты па загатоўцы цыбулі і гуркоў спецыяльных работнікаў.

9. Абавязаць членаў бюро ЦК і упаўнаважаных ЦК і СНК, якія знаходзяцца ў раёнах, устанавіць асобны нагляд і кантроль за ходам загатоўкі і адгрузкі гародніны Ленінграду ў адпаведнасці з гэтым рашэннем.

Даручыць агітмасу ЦК т. ПЫЖЫКАВУ ў сутачны тэрмін намеціць і прадставіць на зацвярджэнне т. Рыскіну спіс адказных людзей у колькасці не менш 30 чал. для камандзіравання ў найбольш рашаючыя і своячасовае разны па загатоўцы і адгрузцы гародніны Ленінграду.

10. Абавязаць упаўкамзак СНК устанавіць штодзённую тэлеграфную справаздачнасць аб ходзе адгрузкі гародніны Ленінграду.

11. Лічыць неабходным у бліжэйшыя дні спецыяльна разгледзець пытанне аб ходзе выканання плана здачы дзяржаве гародніны саўгаснымі трастамі і кожным саўгасам у паасобку і калгасамі сістэмы Бульбатрэстарэцентра.

12. Ухваліць мерапрыемствы, намечаныя ЦК ЛКСМБ па лініі ўзмацнення ўдзела комсамола ў загатоўцы і адгрузцы гародніны Ленінграду. Абавязаць РК аказаць садзейнічанне комсамольскім арганізацыям у правядзенні намечаных ЦК ЛКСМБ мерапрыемстваў па загатоўцы і адгрузцы гародніны Ленінграду.

13. ЦК і СНК звяртаюць увагу ўсіх загатоўшчыкаў РК і РВК на выключную адказнасць, якую яны нясуць за поўнае і своячасовае выкананне планаў адгрузкі добраякаснай гародніны Ленінграду, і папярэджваюць, што ЦК і СНК будуць сачыць за ходам работы па адгрузцы Ленінграду кажнароднага па кожнаму раёну і што за праўленне месніцкіх, антыдзяржаўных тэндэнцый вінаватыя будуць прыцягвацца да партыйнай і судовай адказнасці.

14. Абавязаць радакцыі цэнтральных і раённых газет адвесці спецыяльнае месца на старонках газет і шырока асвятліць работу ўсіх арганізацый па адгрузцы гародніны Ленінграду.

15. Ускласці на тав. Рыскіна персанальны нагляд і кантроль за ходам выканання данай пастановы.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
Старшыня СНК БССР ПАЛАДЗЕД.

СТ. РАГАЧОЎ САБА ТУЕ АДГРУЗКУ

РАГАЧОЎ. (Наш спецкар.).

На станцыйных складах Белплодагародніны скапілася 5.000 тон бульбы. Дзе была толькі магчымасць, пабудавалі часовыя навесы для прыёмкі прадукцыі.

Рагачоўскі раён павінен адгрузіць Ленінграду 9.000 тон, адгружана 2.000. Пры наяўнасці вагонаў Рагачоўшчына матла-б выканаць увесь план да 5-га кастрычніка.

Адміністрацыя Жлобінскага раёна чыгункі замест таго, каб паскорыць зварот вагонаў, пашла па лініі найменшага супраціўлення і забаранила дастаўку бульбы да чыгуначных пунктаў. НД-6 тэлеграфна прапанаваў начальніку станцыі Рагачоў перадаць клієнтуры, каб яна спыніла масавы прывоз бульбы на станцыю, бо вагонаў не будзе.

Калі ў бліжэйшыя дні на станцыі Рагачоў будзе падавацца не менш 50 вагонаў у дзень, бульбу прыдзецца прымаць у самім горадзе, што пацягне за сабой вялікія страты і выдаткі.

Характэрна, што ў той час, як чыгунка не дае вагонаў пад бульбу, на станцыі грузяцца вагоны з пустымі бочкамі. Трэба спыніць сабатаж бульбаадгрузкі на ст. Рагачоў. **Л. К.**

Не дапусціць перабояў на перавалцы

Жлобінскі і Гомельскі вузлы чыгункі парушаюць зэпоўныя правілы сувязі чыгункі і воднага транспарта. На перавалачных прыстанях Гомельпорт і Бабруйск на працягу 8 дзён не падаюцца вагоны для адгрузкі бульбы.

На прыстані Гомель накапіўся запас бульбы ў 1.400 тон і павінна яшчэ прыбыць 1.000 тон. На Бабруйскай прыстані на складах ляжыць 750 тон, а ў суднах 550. Бульба псуецца. Судны прастойваюць...

Хіба чыгуначныя арганізацыі не ведаюць інструкцыю № 2 НКШЗ аб першачарговым забеспячэнні вагонамі перавалачных пунктаў? На ўсе тэлеграмы кіраўніцтва воднага транспарта і ўпаўкамзак ...скага адказ ад чыгункі няма.

А. Цыгет.

ПЕРАДАВІКІ ПАСТАВАК

ШКЛОЎ. (НАШ КАР.).

6 ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ РАЁНА ДА 30 ВЕРАСНЯ ПОЎНАСЦЮ ВЫКАНАЛІ ГАДАВЫ ПЛАН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ. ПЕРШАЙ ВЫКАНАЛА СВАЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЯ КОМУНА «ІСКРА» РЫЖКАЎСКАГА СЕЛЬСОВЕТА, ЯКАЯ ЗДАЛА 180 ЦЭНТН. ДОБРАЯКАСНАЙ БУЛЬБЫ.

КАЛГАС «ЗАВЕТ ЛЕНІНА» ЗАРЭЧНА-ШКЛОЎСКАГА СЕЛЬСОВЕТА ЗДАЎ 168 ЦЭНТН. ВЫКАНАЛІ СВАЕ ЗАДАННІ ТАКСАМА КАЛГАСЫ «ЧЫРВОНЫ МЕЖНІК», «ПРОЛЕТАРЫЯ»— СЛАВЕНСКАГА СЕЛЬСОВЕТА І ІМЯ КАРЛА МАРКСА — ІВАНАЎСКАГА СЕЛЬСОВЕТА. ГЭТЫЯ КАЛГАСЫ ДАБІЛІСЯ ПОСПЕХА НА АСНОВЕ ПРАВІЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ І ЗДАЧЫ АДСАРТАВАНАЙ СУХОЙ БУЛЬБЫ НЕПАСРЭДНА З ПОЛЯ НА ПУНКТЫ.

КАЛАСОЎСКІ.

Тэмпы нарастаюць

СЯННО. За апошнія дні ў Сенненскім раёне шырока разгарнуліся бульбапастаўкі. Двухмесячны план адгрузкі бульбы Ленінгра

Прывітанне ЦК УсеКП(б) т. Мануільскаму

Старому большэвіку, выпрабаванаму ў баях за справу пролетарскай рэвалюцыі, аднаму з выдатных кіраўнікоў міжнароднага комуністычнага руху тав. МАНУІЛЬСКАМУ ЦК УсеКП(б) шле сардэчнае прывітанне ў дзень 50-годдзя.

ЦК УсеКП(б).

ДА 50-ГОДДЗЯ СА ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ТАВ. Д. МАНУІЛЬСКАГА

Сёння спаўняецца 50 год багатага рэвалюцыйнага жыцця тав. Д. Мануільскага. З палкай энергіяй і энтузіязмам, з невычарпальнай ініцыятывай і большэвіцкай рашучасцю ён вядзе барацьбу ў перадавых радах міжнароднага пролетарыята, у сусвет і партыі якога—у Комуністычным Інтэрнацыянале ён працуе на працягу 30-годдзя па адказным кіруючым месцы. З рэвалюцыйнага руху рускага і украінскага пролетарыята, з тэорыі і практыкі большэвікоў ён перанёс у міжнародную класавую барацьбу багаты баявы вопыт.

У хуткім часе пасля свайго ўступлення ў соцыял-дэмократычны рух ён прыняў у 1904 годзе актыўны ўдзел у барацьбе супроць царскага самаўладдзя і ў 1905 годзе арыштаваецца ў Пецярбургу, як адзін з арганізатараў дэманстрацыі супроць рускі-японскай вайны. Пасля вызвалення ён далей вядзе барацьбу ў большэвіцкіх арганізацыях і ў 1906 годзе прыязджае ўдзел у Кранштадскім паўстанні, праўдзіўшы неўстрашымасць і ні пры якіх абставінах не адмяўшуўшы яму паходжваецць у барацьбе с класавым ворагам. Пасля гэтага ён вядзе работу ў Кіеве, але ў хуткім часе вымушан эміграваць заграніцу.

У барацьбе супроць міжнароднага імперыялізма, за справу сусветнага пролетарыята тав. Мануільскі і зараз праяўляе тую адвагу і самаадданасць, якая акрылила яго ў першыя гады яго большэвіцкай работы і рэвалюцыйнай барацьбы.

Шмат ніжкага перыяда эміграцыі на яго бачым яго ў Расіі ў перадавых радах пролетарскай рэвалюцыі пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі камісарам Чырвонай гвардыі ў Красным Пскаве, якая абаранила супроць войск Керэнскага на подступах да Ленінграда першыя заваёвы Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У першых узброеных інтэрвенцыі міжнароднага імперыялізма супроць рэспублікі советаў, тав. Мануільскі, узначальваючы місію Чырвонага Крыжа, быў інтэрніраваны ў 1919 годзе ва Францыі.

У пастуцныя гады мы застаем яго на Украіне на самых трудных пастах, дзе ён прымае ўдзел у барацьбе супроць міжнароднага імперыялізма, супроць сусветнай контррэвалюцыі. У 1920 годзе ён працуе як член Рэвкома Украіны, дзе імперыялістычная контр-рэвалюцыя зноў прабавала стварыць апорны пункт супроць рэспублікі советаў. З 1920 года ён з'яўляецца членам ЦК КП(б)У. З XII-га з'езда партыі з'яўляецца членам ЦК УсеКП(б).

У Комуністычным Інтэрнацыянале тав. Мануільскі ў якасці аднаго з яго кіраўнікоў прымае ўдзел у распрацоўцы важнейшых пытанняў міжнароднага рэвалюцыйнага рабочага руху і дае ўзоры таго, як трэба праводзіць гэтыя рашэнні на справе, у барацьбе за заваяванне большасці рабочага класа, за перамогу пролетарскай рэвалюцыі.

Секцыі Комінтэрна, складаныя пытанні якіх выраблаліся пры яго кіруючым удзеле, могуць адзначыць не толькі яго большэвіцкую эрудыцыю, яго востры палітычны розум, яго зоркае вока, але і разумение канкрэтнай абстаноўкі па кожным участку барацьбы, яго такт пры разборы ўнутрыпартыйных пытанняў, яго цёплыя таварыскія адносіны да тых, якія падпадаюць крывавым праследванням контр-рэвалюцыі.

Мы жадаем таварышу Мануільскаму далейшай паспяховай барацьбы ў перадавых радах міжнароднага пролетарыята.

КАТАЯМА, ПЯТНІЦКІ, МАРЦІ, КНОРЫН, КУУСІНЕН, БЕЛА КУН, ГЕКЕРТ, ЛАЗОЎСКІ, ВАН МІН, ГАЛЛО. СТАСАВА, ВАЙНСТОН, РЭСТ, КОЛАРАЎ, КООТАНЯН, БЕЛЕЎСКІ, ОКАНО, ГОПНЕР, ДЭНГЕЛЬ, ЧЗМАДАНАЎ, АНГАРЭТЫС, ГАНСЕН, МІЦКЕВІЧ, ІСКРАЎ, МАННЕР, МАДЖЫ, РОМЕРО, ГРОСМАН, ЦХАКАЯ, ПОСТМА.

ПРЫВІТАННЕ ТАВ. МАНУІЛЬСКАМУ АД БОЛЬШЭВІКОЎ УКРАІНЫ

Шлем сардэчнае прывітанне Дзімітрыю Захаравічу Мануільскаму ў дзень яго шэсцдзесятага юбілея.

Украінская партыйная арганізацыя добра ведае і любіць тав. Мануільскага як адданага большэвіка, як аднаго з арганізатараў совецкай улады на Украіне, як аднаго з яе кіраўнікоў у самыя цяжкія гады грамадзянскай вайны і мірныя гады мірнага соцыялістычнага будаўніцтва, як стойкага непрымірымага барацьбіта за генеральную лінію партыі і Комінтэрна супроць шавіністаў і нацыяналістаў, супроць усіх ворагаў рабочага класа.

Мы ўпэўнены, што тав. Мануільскі здолее яшчэ многія гады служыць нашай большэвіцкай ленінскай партыі ў справе міжнароднай пролетарскай салідарнасці так-жа аддана і верна, як ён гэта рабіў да гэтага часу.

НАВІОР, ПОСТЫШАЎ, ПЕТРОЎСКІ, ЧУБАР, БАЛІЦКІ, ЯКІР, ЗАТОНСКІ, СУХАМЛІН, ЧУВЫРЫН, ПАПОЎ, ЛЮБЧАНКА, ШЛІХТЭР.

ПРЫВІТАННЕ МАКСІМА ГОРКАГА

Таварышам Пракоф'еву, Бірнбаўму, Гадунову, інжынэрам і рабочым 39-га завода, будаўнікам стратастата

Адважным вашым палётам вы узнялі сваю краіну яшчэ вышэй у вачах пролетарыята ўсяго света і ў вачах усіх сумленных людзей. Няхай жывуць адважныя, мужныя людзі Саюза Совецкіх Рэспублік, пераможцы пустыні, пераможцы вышынь, пераможцы ўсіх перашкод на шляху да разумнага, сумленнага радаснага жыцця!

М. ГОРКІ.

НОВАЕ ПАПАЎНЕННЕ ПАЛІТАДДЗЕЛЬСКАМУ ДРУКУ

Для работы ў Палітаддзельскія газеты накіроўваюцца рэдактарамі 12 чалавек. У слуцкую МТС — тав. БУЛКО, Лёзненскую—тав. ШПІЦЭР, Дрысенскую—т. ПАСТУХОВА, Гарадонскую т. ЗЕЛЬЦЭР, Рагачоўскую—т. ВЯРХОЎСКІ, Цялушскую—т. ГЕЛЬФАНД, Жлобінскую—т. БУРДО, Сенненскую—т. АРЛОЎСКАЯ, Дзяржынскую—т. РАДКЕВІЧ, Боркавіцкую—т. АДАС, Пухавіцкую—т. ЖУК, Дамановіцкую—т. ДУБРАВІЦКІ.

Сёння мы змяшчаем кароткія біяграфіі некаторых з гэтых таварышоў.

ЗЕЛЬЦЭР Б. Г. 1906 года нараджэння, латыш, член партыі з 1928 года. Паходзіць з сялян-беднякоў. Бацькі зараз працуюць у калгасе. З 1921 года да паловы 1922 г. тав. Зельцэр працуе грузчыкам на чыгунцы, пасля выслужэцца на пасаду дзесятніка па пагрузцы лесаматэрыялаў і дроў.

У канцы 1924 г. тав. Зельцэр пасылаецца для ўмацавання работы ў вёску, дзе працуе да канца 1930 г. У 1930 г. тав. Зельцэр паступае ў камвуз Беларусі імя Леніна. У маі 1931 г. адкліканецца з вучобы і пераходзіць на работу ў сектар друку ЦК КП(б)Б інструктарам. З мая бягучага года працуе ў БЕЛТА часова адказным кіраўніком. Зараз палітсектарам НКЗБ накіроўваецца рэдактарам газеты палітаддзела Гарадокскай МТС.



РАДКЕВІЧ С. К.—1906 г. нараджэння, паляк, член партыі з 1928 г. З 1917 года па 1925 г. тав. Радкевіч працаваў батраком у кулакоў Плешчаніцкага раёна. У 1924 г. уступае ў комсамол і ў канцы 1925 г. камандыруецца ў Магілеўскую саўпартшкопу І-й ступені, дзе вучыцца да 1927 года на польскім аддзяленні. Пасля сканчэння саўпартшкопы накіроўваецца ў Нараўлянскі раён, Кустовіцкі польскі нацыянальны сельсавет, дзе працуе хаткінам.

У 1930 г. тав. Радкевіч пераходзіць на работу ў польбюро пры менскім акруговым камітэце комсамола, потым працуе ў ЦСПСБ намеснікам загадчыка культсектара і ў канцы 1930 г. з верасня па снежань—загадчыкам польскай семігодкі ў Менску.

У пачатку 1931 г. пераходзіць на працу ў газету «ОРКА», дзе працуе дагэтуль. Зараз накіроўваецца рэдактарам газеты палітаддзела Дзяржынскай МТС.

БУЛКО О. А.—1901 г. нараджэння, беларуска, член партыі з 1928 г. Паходзіць з сям'і рабочага. Бацька працаваў кандуктарам на чыгунцы. З 1919 г. па 1928 г. тав. Булко працуе настаўніцай: чатыры гады ў вёсцы і пяць год у горадзе. У 1928 г. канчае цэнтральную саўпартшкопу імя Леніна і пераходзіць на работу ў ЦП саюза асветнікаў, дзе працуе загадчыкам арганізацыйнага аддзела. З канца 1931 г. і да гэтага часу тав. Булко працавала ў рэдакцыі часопісі «Работніца і калгасніца» намеснікам рэдактара. Зараз накіроўваецца рэдактарам газеты палітаддзела Слуцкай МТС.

ГЕЛЬФАНД М. І.—1905 г. нараджэння, яўрэй, член партыі з 1928 г. Паходзіць з рабочай сям'і. Бацька—рабочы-шавец 11-гадовым хлапчуком тав. Гельфанд пачынае працаваць па найму спачатку ў прыватных шавецкіх майстэрнях, потым у працоўных калектывах да 1928 г. 1928—1930 г.—вучыцца ў гомельскай саўпартшколе. Пасля сканчэння школы займаецца на чатырохмесячных курсах газетных работнікаў і накіроўваецца на работу ў рэдакцыю газеты «Калгаснік Беларусі», дзе працуе спачатку загадчыкам масавага сектара, потым загадчыкам партсектара, адказным сакратаром рэдакцыі. Працуючы ў рэдакцыі, увесь час з'яўляўся сакратаром партыйнай ячэйкі. Зараз накіроўваецца рэдактарам газеты палітаддзела Цялушскай МТС, Бабруйскага раёна.

ПРАВІЛЬНЫ СЕВАЗВАРОТ—ЗАРУКА ВЫСОКАГА УРАДЖАЮ БУДУЧАГА ГОДА

ДА АДКАЗНАСЦІ ЗЛОСНЫХ ПАРУШАЛЬНІКАЎ СЕВАЗВАРОТАЎ І АГРАТЭХНІКІ

РЭЗУЛЬТАТ РАПАРТАМАНІІ І АШУКАНСТВА

ПАРЫЧЫ. (Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

Парыцкі раён, паводле зводкі райзямаддзела, на 25 верасня засеяў 96,4 проц. азімых і заняў па сяўбе трэцяе месца ў рэспубліцы.

Загадчык парыцкага райзямаддзела т. **Бусел** з пецярпліваснію чакае апошніх зводак з сельсоветаў, каб рапартаваць аб поўным выкананні плана азімай сяўбы.

Гэта ў лічбах, а на справе?

Вось мы ў перадавым і самым буйным Казлоўскім сельсавеце. Тут налічваецца 12 калгасаў і 800 аднаасобных гаспадарак.

Старшыня сельсовета Халадок першым у раёне адрапартаваў аб поўным выкананні плана сяўбы. І зараз Халадок сцвярджае, што план выкананы поўнасцю. У пацвярджэнне ён спасылаецца на рапарты членаў сельсоветаў. Але паваг павархоўны аналіз гэтых «рапартаў» паказвае, што па сельсавету засеяна 1.700 гект., г. зн. недасеў у 124 гект. Прыпёрты да сцены старшыня сельсовета прызнаўся, што 124 га ён уключыў у зводку «авансам» пібыта на тэй падставе, што яны «безумоўна будуць засеяны».

Далейшая праверка выявіла, што бессаромная «очковтирательство» і рапартаманія ў Парыцкім раёне — пашыранае з'явішча.

Член гэтага-ж Казлоўскага сельсовета **Муроль** паведаміў, што яго ўчастак поўнасцю выканаў план сяўбы — засеяна 300 га. На справе-ж аказалася, што калгас «Другая пяцігодка» замест 90 га засеяў 75 і зараз спыніў сяўбу, бо пасевне загадзя не было поўнасцю падрыхтавана. Толькі цяпер старшыня аб гэтым успомніў і пераключыў людзей на малацьбу. 28 верасня ў калгасе пазалі жаць пасевны лубін, пасля ўборкі якога поле будзе падрыхтоўвацца пад жыта. Адным словам, гэты калгас закончыць сяўбу толькі ў першых лічбах кастрычніка.

Такі-ж малюнак і ў іншых калгасах. Калгас імя Варашылава яшчэ не засеяў 10 га, калгас «Чырвоная зорка» засеяў толькі 70 проц. азімага кліна. Не закончылі сяўбу і аднаасобнікі. Гэта, аднак, ніколькі не заклапаціла ашуканцаў з Казлоўскага сельсавета, якія рапартавалі аб 100-процантным выкананні сяўбы.

Дзе карэнні гэтага ашуканства?

Старшыня сельсовета Халадок увесь час сядзіць у канцылярыі. Ён зусім адарваны ад калгаснай вытворчасці і слепа верыць на слова данясеннем з вёсак і ніколі іх не правярае.

Загадчык райзямаддзела т. Бусел у сваю чаргу слепа верыць старшыні сельсовета і таксама ніколі не правярае фактычнага становішча справы на месцах, не гледзячы на тое, што вёска Казлоўка знаходзіцца ўсяго па адлегласці 1 клм. ад райзямаддзела.

Гэта колькасны бок справы. Пярэйдзем да якасці. З 12 казлоўскіх калгасаў ні ў адным не ўведзен севазварот. У выніку самае грубае парушэнне агратэхнікі і аграмінімума: сяўба азімых праводзіцца проста нашкодніцку. Калгас «**Другая пяцігодка**» з 75 га жыта, 50 засеяў на аўсяніцы і іншых, збожжавых, без усякага ўгнаення глебы. Гатунковае жыта высяваецца на адным кавалку са звычайным. Гэта значыць, што пры апыльванні гатунковае жыта перарозніцца і дасць значна меншы ўраджай.

Аднаасобны сектар у раёне займае 55 проц. Не гледзячы на гэта сяўбой поўнай мэты — сарваць сяўбу. Прадукцыйнасць працы ў калгасе вельмі нізкая, нормы на ворыве і сяўбе не выконваюцца.

З благаслаўлення брыгадзіра Грыневіча, былога заможніка, сяўба праводзіцца па-шкодніцку, з мэтай мэтай зніжць ураджайнасць. Жыта на 15 проц. засмечана і мае 80 проц. ўсхожасці. Сеюць у аднавор, на няўгноенай глебе, хоць на калгасных дварах ёсць да 500 вазоў гною. Пасевы бараноўцца ў адным напрамку, ад чаго парушаецца структура глебы і затаецца дзірван.

На чале гэтага калгаса стаіць комуніст Пілішаў. Ён страціў класавую пільнасць і не бачыць шкодніцкай дзейнасці кулацтва.

Студэнты с.-г. інстытута — **А. Камольцаў, П. Шыян, А. Вільчынскі, М. Сідаровіч.**

Кулацкія элементы зрываюць сяўбу

ГОРКІ.

У калгасе «Шлях соцыялізма» зацягваецца сяўба. Палова азімага кліна не засеяна. З 75 гектараў жыта засеяна 40. Ішаніцы не засеяна ні аднаго гектара, а трэба засеяць 10 гектараў.

Гэта не выпадковасць. Варожыя элементы робяць усё магчымае, каб сарваць сяўбу ў калгасе. Сваю дзейнасць яны накіравалі на самы важны ўчастак — стайню. Цягавая сіла выведзена са строя. На конях нельга працаваць, да такога стана давёў іх конюх, крымінальны злачынец Зяньковіч і кулак Біленя Андрэй. Раней Біленя меў 20 гектараў зямлі, трымаў батрака. Карыстаючыся слепатой мясцовых арганізацый, ён пралез у калгас, а потым на калгасную стайню і морыць коней.

Класава-варожыя элементы, знічачы цягавую сілу, праследуюць мэту — сарваць сяўбу. Прадукцыйнасць працы ў калгасе вельмі нізкая, нормы на ворыве і сяўбе не выконваюцца.

Партыяй і ўрадам паставлена перад зямельнымі органамі МТС і калгасамі адказнейшая задача: на аснове поспехаў, дасягнутых у часе сяўбы і ўборкі, дабіцца ў будучым годзе яшчэ больш высокага ўраджая. Гэта патрабуе ў першую чаргу правільнага планавання і кіраўніцтва сельскай гаспадаркай з боку раённых арганізацый, кіраўніцтва не наогул, а канкрэтна, выходзячы з умоў кожнай гаспадаркі.

На практыцы Парыцкага раёна мы бачым, да чаго прыводзіць пагоня за голай лічбай, да чаго прыводзіць рапартаманія, да чаго прыводзіць апартуністычная слепата і адарванасць раённых арганізацый ад калгаснай вытворчасці.

П. Арцельны.

АД РЭДАКЦЫІ: Звяртаючы ўвагу Наркамзема на паданыя вышэй факты, мы чакаем канкрэтных мер па закранутым пытанні і прыцягнення да адказнасці вінаватых у ашуканстве партыі і ўраду і парушэнні копа аб аграмінімуме.

УСЕБЕЛАРУСКІ ПАХОД ЗА ВЫСОКАЯКАСНУЮ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛЮ

АТАВУ, БАЦВІННЕ І БУЛЬБЯНІК—У СІЛАСНЫЯ ЯМЫ І ВЕЖЫ

Калгасы Рагачоўскай МТС прынялі выклік калгаснікаў Случчыны

На жывёлагадоўчай нарадзе калгасаў Рагачоўскай МТС

Трэба, безумоўна, вітаць удалым і карысным вопыт склікання палітаддзелам рагачоўскай МТС участковых нарад па вытворчасці калгасных жывёлы ў зімоўкі, па ўключэнню за ўсебеларускі паход за высокаякасную жывёлагадоўлю.

Першы этап работы палітаддзела — барацьба, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў па падставе барацьбы за большэвіцкі ўраджай. Аб гэтым лепш за ўсё сведчыць тая вядучая роля, якую калгасы МТС адыгрываюць у раёне. Стопроцантным выкананнем планаў паставак і азімай сяўбы калгасы МТС цягнуць за сабой усе калгасы раёна. У раёне дзейнасці МТС паблізлецца да завяршэння збожжапаставак і аднаасобны сектар. Зараз палітаддзел узяў на сябе ініцыятыву на ўключэнню раёна за ўсебеларускі паход за высокаякасную жывёлагадоўлю. 30 верасня ў Ціхінічах адбылася жывёлагадоўчая нарада калгасаў 2-га і 3-га вытворчых участкаў МТС. У нарадзе прымала ўдзел 60 калгаснікаў, у тым ліку загатчыкі ферм, свінарны, даяркі і пастухі.

Становішча жывёлагадоўлі ў раёне зусім незадавальняючае. Даводзі прывесці той факт, што вясной загінула 16 проц. цялят і 27,7 проц. парасят. Сёлета стада ў калгасах дасягае толькі 55 проц. плана, а колькасць свіноматак—48,5 проц. План здачы свінога мяса выкапан толькі на 57,9 проц.

Калгаснікі, выступаючыя ў спрэчках па дакладу аб становішчы жывёлагадоўлі на двух участках МТС, шматлікімі фактамі паказалі, што калгасы вораг выбраў сабатажгадоўчыя і малочныя фермы цэнтрам сваёй работы, у той час, як асноўная масе калгаснікаў-ударнікаў была занята наступленнем на фронце барацьбы за ўраджай.

Возьмем калгас «**Дабрэсці**». Два гады таму назад тут была заснавана свінаферма, куды былі дастаўлены 4 свіноматкі. Але за два гады на ферме не было ні аднаго аляпоса. Праўленне калгаса не захацела набудаваць патрэбныя для фермы 4 стайні і 4 кармушкі. Жонка кладаўшчыка Кастуева, якая даглядае свіней, сістэматычна раскрадвае кармы, вызначаныя для фермы.

Калгас імя **Красіна**. Парасят кормяць толькі адзін раз у дзень. На ферме гразь. Выпаса няма. Парасяты галадаюць і хварэюць, і у выніку — амаль усе яны загінулі. На малочнай ферме кароваў не выдойваюцца, уліку малака няма. Падсцілаюць дрэнна. Каровы даюць у сярэднім не больш трох літраў малака.

Калгас «**Друць**». Усяго нагадуя ў калгасе 94 штукі. Каровы стаяць па жывот у гразі. Да іх, лігарыла, нельга падступіцца, так што часта каровы стаяць падоеныя. Даводзі сказаць, што 34 малочныя каровы даюць у дзень толькі 50 літраў малака.

Такіх фактаў можна было-б прывесці шмат. Яны вельмі яркі сведчаць пра тое, што ў раёне ажыццяўлялася кіраўніцтва жывёлагадоўляй, што раённае жывёлагадоўчае аб'яднанне спартала надзвычай мала ўвагі на малочныя і свінагадоўчыя фермы.

Між тым, у раёне ёсць сапраўды ўзорныя фермы, якіх можна паставіць у прыклад шмат якім фермам не толькі аднаго Рагачоўскага раёна.

Возьмем ферму калгаса «**1 мая**». Ферма была заснавана летась усяго толькі з адной свіноматкі. Сёлета ферма ўжо мае 69 свіней.

Або возьмем калгас «**Комуна**», дзе 9 свіноматак далі ўвесну 40 парасят, а верасневым апаросам зноў 52 парасяці, прычым некаторыя свіноматкі прынеслі па 13-14 парасят. Свінаркі паставілі работу на ферме так, што ні адно парасё не здохла.

Калгас «**Крым**» з 37 галоў прыплода мае ўсяго толькі два здыхла. Не маючы свінарніка, калгас прыстасаваў для гэтай мэты кулацкае памно. Кожная свіння мае сваю кармушку. Ёсць патрэбны мінеральны падкорм. Лодзь не круглыя суткі свінні на выпасе, нагадуе вельмі добра нагульнае тлустасць.

У цэлым радзе калгасаў свінагадоўчыя і малочныя фермы пастаўлены такія ўмовы, што яны сапраўды могуць развівацца.

Палітаддзел арганізаваў на нарадзе паказ работы лепшых ферм. Выступіў тав. Азаренак з МТФ калгаса «Чырвоныя боркі» расказаў, як дабіліся яны спрадняга ўдоя у 28 літраў з 3-х малочных кароў. Актыўны ўдзел у нарадзе ва каровамі прымаюць даяркі, якія матэрыяльна зацікаўлены ў большым удоі. Хлеў, у якім стаяць каровы — цёплы. Кожная карова мае сваю кармушку. Падсцілкі хапае. Вымае лепшы. Кожная даярка мае скамеечку, пасыпае таму, каб даярка лепш выдойвала каровы. План здачы малака і мяса выкапан па 100 проц.

Але адначасова ў калгасе мае месцы самае ашуканскае разбазіраванне і расхрадванне цялят. З 47 ацёлаў у калгасе засталіся толькі 4 цяляты. Куды падзеліся астатнія — праўленне калгаса не ведае. Гэтан справай, відаць, прыдзецца зацікавіцца пракурору.

Сваім вопытам работы на фермах дзяліліся т. т. Бабкоў — загадчык СТФ калгаса «Чырвоны Крым», т. Журэўлёва — наглядчыца за цялятамі ў калгасе «Правда» і рад іншых таварышоў.

Участковая нарада падагуліла лепшыя ўзоры работы па жывёлагадоўлі, выяўленыя на папярэдніх вытворчых нарадах у кожнай МТФ і СТФ.

І зусім меў рацыю начальнік палітаддзела тав. Вайман, які, таньбуючы калгасы «Друць» і «Дабрэсці» за «свінскія» адносіны да жывёлы, мабілізаваў чытачоў нарады на канкрэтных прыкладах шкодніцкіх кулацкіх адносін да жывёлагадоўлі, заклікаў калгаснікаў да барацьбы за цёплы хлеў, за добры подсціл, за правільнае кармленне.

Палітаддзел пераняў арганізаванае праведзенне ўсімі загатчыкамі МТФ і СТФ, даяркамі, свінарамі і пастухамі лепшых жывёлагадоўчых ферм для таго, каб непасрэдна на месцах, на канкрэтных узорах показаць, як можна дабіцца добрых вынікаў.

Адказваючы на заклік спуцкіх калгаснікаў, нарада пастанавіла ўключыцца ва ўсебеларускі паход за высокаякасную жывёлагадоўлю і « выклікнуць на соцспаборніцтва другія ўчасткі МТС.

Нарада абавязалася безадкладна распачаць работу па сіласаванні з тым, каб забяспечыць сіласам не толькі аграмаднянае стада, але і каровы калгаснікаў і аднаасобнікаў па дзесяці дворках.

Нарада паставіла ў прыклад усім фермам МТФ калгаса «Авангард», дзе аплата робіцца з колькасці надоенага малака, а не кароў. Сярэдні ўдой на ферме складае 6 літраў, ферма дала ўжо калгасу 4.000 руб. прыбытку, а да канца года дасць яшчэ столькі.

Палітаддзел Рагачоўскай МТС паабяцаў большэвіцку ўзяўся за разгортванне ўсебеларускага паходу.

Задача раённай [illegible] цяпер заключаецца [illegible] тыку палітаддзе[illegible] калгасы раёна [illegible] безмаслана [illegible] і сітуацыі [illegible] доўчых [illegible].

Я. Вайчштэйн

АДСТАВАННЕ ГОРАЦКАГА РАЁНА—РЭЗУЛЬТАТ АДСУТНАСЦІ ПЕРАБУДОВЫ ПАРТРАБОТЫ

«... Калі сельская, або калгасная ячэйка большэвіцкую ідэйна слабо ўзброена і не грае ролі арганізатара, агітатара, то ў калгасе парадку не будзе».

(Л. КАГАНОВІЧ).

Горацкі раён сістэматычна пляцецца ў хвосце ў выкананні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній. Раён за 25 верасня зжаў азімых 92 проц., прычым далёка не ўсё звезена. Засеяў азімых жыта 84,1 проц. плана, а ішаніцы, не гледзячы на добрую глебу — толькі 37,6 проц. плана. Гадавы план збожжапаставак на гэта-ж число выканан на 35,7 проц., а натуроплаты МТС на 23,1 проц.

У чым-жа справа, дзе крыецца прычына гэтага адставання? На гэта пытанне зусім ясна дае адказ пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб становішчы кіраўніцтва горацкай партарганізацыі. У гэтай пастанове занесена: «Горацкі РК КП(б)Б не змог поўнасцю ўключыцца ў чыстку, забяспечыць усямерную дапамогу і выдзіраванне раённай камісіі па чыстцы, увязаць пытанне чысткі з правядзеннем асноўных с.-г. работ як вясной гэтага года, так і бягучую ўборку, загатоўку і асеннюю сяўбу, пастаўшы Горацкі раён у лік адстаючых раёнаў рэспублікі... Кіраўніцтва Горацкага райкома таксама не аказала належнага водтрымання палітаддзелу МТС у яго барацьбе за ачыстку калгасаў ад кулацтва, прычым была спроба асобных членаў бюро РК (Кандраль) ба асобных становішча ў раёне ў частых засмечанасці рада калгасаў кулацкімі элементамі і яўнае прымірэнцтва ў адносінах асобных людзей, вызначаных палітаддзелам з калгаса».

Справа ў тым, што горацкая партарганізацыя ў цэлым і ў прыватнасці вясковая—працуе недапушчальна дрэнна і перабудавана яна больш фармальна, чым на сутнасці.

За апошнія два з паловай месяцы горацкая вясковая партарганізацыя перабудоўвалася 4-5 раз. Праўда, у асобных выпадках гэта выклікалася тым, што ў сувязі з выключэннем з партыі [illegible] і [illegible] колькасці [illegible] [illegible] у [illegible] [illegible] месяц трэба нанава перастаўляць партыйныя сілы. Але гэта не асноўнае. Асноўнае заключаецца ў тым, што кіраўніцтва не ўзяло неабходнай упартай барацьбы за перабудову, за правільную не толькі расстаноўку (больш пастаянную) партыйна-комсамольскіх сіл, але і за арганізацыю штодзённай большэвіцкай работы. Даволі прывесці некалькі канкрэтных фактаў работы ніжэйшых партзвеньняў па Панкратаўскім, Гарадзецкім, Чэрнеўскім і Жданаўскім сельсоветах, каб у гэтым наглядна пераканацца.

Па Панкратаўскім сельсавеце парторг калгаса «Просты шлях» **Семёнаў** (настаўнік) за два месяцы быў у сваім калгасе 4 разы (апошні раз быў 3-IX—1933 г.) і правёў адзін сход беднаты (па аднаасобным сектары), два разы пагаварыў аб затаўках і арганізаваў групу спачуваючых — 4 чал., з якімі да гэтага і пасля ніякай работы не праводзіў. На гэтым канчаецца яго «работа». А што робіцца ў яго калгасе, як выконваюцца загатоўкі, азімая сяўба, як арганізоўваецца масава-палітычная работа — гэтага парторг Семёнаў не ведае, або ў лепшым выпадку даведваецца пра старшыню калгаса, з якім дзе-небудзь выпадкова сустракаецца.

Парторг калгаса «Пэўны шлях» — **Хундуратаў** (старшыня калгаса) абмежаваўся тым, што па заказу сакратара тэрытарыяльнай ячэйкі **Шэйніна** арганізаваў групу спачуваючых. Але далей — ні крока, ніякай работы з імі. А з поля не звезена аўса 6 га, ільна 9 га. Азімых пасеяна на 25 верасня толькі 35 га (план 55 га), а ішаніцы (план 10 га) нічога не пасеяна. Абмалот і збожжаздача зацягваюцца.

Парторг калгаса «Чырвоная зорка» **Гладкі** (старшыня сельСТ), не гледзячы на тое, што часта бывае ў калгасе, не ведае, што робіцца ў ім. Гладкі нават не ведае, колькі працаздольных у калгасе, не гаворачы ўжо аб такіх пытаннях, як размеркаванне ўраджая, севазварот, пасевы і г. д. У групу спачуваючых тут залічалі толькі тых, на каго ўказвалі: «гэта — добры калгаснік, можна запісаць».

Таксама не разгарнуў сваю работу парторг калгаса «Большэвік»—**Шэйнін** (заг. райзагатмяса), які абмежаваўся толькі вельмі рэдкімі наездамі. У калгасе імя Варашылава, дзе ёсць два комуністы і тры комсамольцы так і не ведалі (у тым ліку і РК), якую арганізацыйную форму ім надаць.

З усяго гэтага зразумела, чаму Панкратаўскі сельсавет выканаў толькі 32,5 проц. гадавога плана збожжаздачы і пасцыл адстае па многіх гаспадарча-палітычных кампаніях.

Апрача фармальнага падыхода да выканання пастановы ЦК УсеКП(б) ад 15 чэрвеня аб перабудове, комуністы Панкратаўскага сельсавета сказілі зусім выразнае указанне ЦК КП(б)Б аб групах спачуваючых. У гэтай пастанове ЦК КП(б)Б гаворыцца, што «**ў мэтах забеспячэння правільнага выканання пастановы ЦК УсеКП(б) аб арганізацыі ў калгасах груп спачуваючых, неабходна зараз-жа разгарнуць глыбокую арганізатарскую і масавую работу сярод калгаснага актыва, выяўляючы сапраўды адданых і праверэных на рабоце ў вытворчасці, адносіны іх да калгаснай маемасці і г. д.**».

Па **Гарадзецкім сельсавеце** два парторга (старшыня сельсавета і старшыня сельСТ) да гэтага часу былі прымацаваны да 6 калгасаў (па тры калгаса на парторга). Зараз ім РК пакінуў на адным калгасе. Але бяда тут у тым, што замест дзелавой і канкрэтнай работы, ідуць бязупынныя нерамацаванні і азнаямленні, а работа працягвае адставаць.

Вельмі характорна, што ўсе ўказаныя факты праходзяць на вачох кустарганізатара па гэтых двух сельсаветах — члена бюро РК КП(б)Б, рэдактара раённай газеты **Сакалоўскага**, які, відавочна, лічыць ніжэй свайго гонара займаць арганізацыяй партработы. Сакалоўскі на кустнарадзе кіраўнікоў партыйна-комсамольскіх звеньняў гэтых двух сельсаветаў нават не палічыў патрэбным сказаць слова. Пустае пытанне, чаводта-ж РК паслаў Сакалоўскага куставым партарганізатарам?

Па **Чэрнеўскім сельсавеце** характэрна поўная бяздзейнасць парторгаў калгаса імя Будзённага і Чапаева, а таксама дрэнная арганізацыя работы кандыдацкай групы комуны «Чырвоная вага».

Парторг калгаса імя Будзённага **Нікіценка** (заг. гаспаддаркай крухмальнага завода), маючы групу калгаснага актыва—8 галавок (праўда, створаную без вывучэння людзей) і ячэйку ЛКСМБ—6 чал. зусім імі не кіруе і паступ нічога не робіць у калгасе. Уся работа Нікіценкі пакуль што заключалася ў тым, што ён за два з паловай месяцы правёў два калгасных сходы і дапамог выпусціць адну насценгазету. Апошняя 5 тыд. ён у калгасе зусім не быў. Такую сваю «актыўнасць» ён тлумачыць тым, што «раз я сраўню загадчыкам гаспаддаркі крухмальнага завода, то быць парторгам калгаса не магу».

Парторг калгаса імя Чапаева **Папсуеў** (заг. сямігодкай) у сваім калгасе зусім не працуе. Пасля доўгай інфармацыі на куставай нарадзе парторгаў з калгасным актывам двух і сельсавету Папсуеву задаюць пытанні:

— Колькі ў гэбе ў калгасе калгаснага актыва?

— Дзесяць чалавек.

— Назаві іх прозвішчы.

Падумаўшы мінут пяць, Папсуеў ад казвае:

— Не ведаю.

— Колькі працаздольных у калгасе?

— 80 чал.

Старшыня гэтага калгаса т. **Лісоў** папраўляе: **толькі** 62 чал.

— Калі ваш калгас скончыць азімую сяўбу?

Папсуеў разяўіча, адказвае:

— За два-тры дні.

Старшыня калгаса на аснове даклад ных разлікаў гаворыць, што сяўба будзе скончана за 5 дзён, бо калгас з многімі работамі адстаў.

Кандыдацкая група комуны «Чырвоная зара» хоць і мае 3-х комуністаў, ячэйку комсамола — 10 чал. і нямала добрых ударнікаў -актывістаў, усё-ж работы як след не арганізавала. Нелепы пакуль што працуюць і парторгі калгасаў Жданаўскага сельсавета. Наўрад, каб лепш сталла справа з перабудовай партработы ў большасці іншых калгасаў раёна, бо пералічаныя сельсоветы лічацца ў раёне сярэднімі і вяўляюцца характэрнымі для многіх астатніх даната раёна.

Для ясасці агульнай дрэннай перабудовы і пастаноўкі партработы ў вёсцы па Горацкім раёне трэба далаць, што палітвучобы комуністаў, комсамольцаў і беспартыйнага калгаснага актыва амаль няма зусім. Комсамольскія ячэйкі недадзіўчальна дрэнна працуюць. Гэта сведчыць аб дрэнным кіраўніцтве комсамолам з боку партарганізацыі.

РК КП(б)Б за час перабудовы (апошніх 3 месяцы) паслаў з раёна на работу ў калгасы толькі 4 чал., у той час, калі значна меншыя раёны Беларусі паслалі за гэты час у невялікі разоў больш. Праўда, РК КП(б)Б 13 верасня пастанавіў мабілізаваць 15 комуністаў на работу ў калгасы і нават указаў каго, але ні адзін з іх не паехаў. Правільна і другое, што РК КП(б)Б 21 верасня пастанавіў выключыць з партыі 2 чал. за адмаўленне паехаць працаваць у калгас, а іншых перадаў на разгляд РК КП(б)

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА

УМАЦУЕМ ТЭХНІЧНЫМІ КІРАЎНІЦТВАМІ НІЗАВЫЯ ВЫТВОРЧЫЯ ЗВЕНІ

Тав. АСТРОЎСКІ
майстар 1-га хром. цэха заў. «БОЛЬШЭВІК»

Навучаю кожнага рабочага аўладаць тэхнікай работы

Я перакінут у першы хром. цэх у якасці намесніка старшага майстра цэха і майстрам аддзелачнага аддзялення з 18/VIII—38 г. Першая мая работа ў цэху была пікавідацыя вузкага месца рамчыстка аддзялення, якое мела рад перашкод у сваёй рабоце. Рамшчыкі не паспяваючы прапускаць увесь тавар і прыходзіцца працаваць звыштэрмінова, уходзіць шмат цэлюлоіду, многа пара і г. д.

Вынаходніцтва аб наклейцы скуры на рамы дазіна даць павялічэнне плошчы эканомі цэлюлоіду, пары і г. д. Гэта работа зусім слаба праводзілася ў цэху з-за адсутнасці механічнай камеры. Калі пачаў ў Дзень усяго 50-80 рам. Я падняў пытанне аб пабудове ў цэху механічнай камеры, якая гэтымі днямі будзе ужо закончана. Прапускная здольнасць камеры—600 скур з двума абаротамі, г. зн. 1200 скур. Праўда, механічны цэх крыху затрымлівае пабудову, на што патрэбна будзе заводаніраўніцтву звярнуць увагу. Ня меншую ўвагу я ўдаю пытанню правільнай расстаноўкі рабочай сілы. Былі такія факты ў брыгадзе рамшчыкаў, калі новыя рамшчыкі працавалі асобна ад старых і не выконвалі сваю норму. Мы-ж пры актыўкай падтрымцы партгрупы і ўсёй брыгады рамшчыкаў расстаўлялі сілу такім чынам, што ў адной брыгадзе працуюць двое старых і двое новых і першыя перадаюць вопыт сваёй работы новым рамшчыкам, пасля чаго павялічылася выкананне прэмфінплана.

Услед за брыгадай рамшчыкаў пацягнуліся абрэзчыкі, шпрэйцоўшчыкі і глянцоўшчыкі, якія таксама павялічылі норму і даюць звыш плана 400—500 сяўных скур. Асаблівую ўвагу, аддаюць важнейшаму ўчастку, г. зн. якасці прадукцыі. Уважліва сачу за якасцю работы кожнага працоса, практыкна дапамагаю і раю кожнаму рабочаму, як лепш апрацаваць тавар. І мы зараз маем вялікі зрух у якасці прадукцыі. Гэта хаця-б паказвае той факт, што мы зараз не маем скаргаў ад нашых спажыўцоў. Работу мы размяркоўваем з аднаго дня на другі. Такім чынам рабочы раніцою прыходзіць у цэх ведае, дзе ён павінен стаць, які тавар ён павінен апрацоўваць, колькі і г. д. Таксама прытаваны розныя глянцы. Праўда, мы яшчэ маем рад непаладкаў якія ўплываюць на нялоўную нагрузку рабочага дня. Не хапае розных вёдраў, інструментаў, ёсць яшчэ выпадкі хаджэння па цэху, размовы ў часе працы.

Зараз мы комплілі ўвесці інстытут неквалійкаваных рабочых для паднос. ні тавара, таксама абавязалі рымара прыходзіць да работы, агледжваць рамні, слесар у часе абеда будзе праглядваць становішча машын. Усё гэта павялічыць нагрузку рабочага дня.

З. ВАСІЛЬЕВА
інжынер Белдрэс імя Сталіна

ДАБ'ЕМСЯ БЕСПЕРАБОЙНАЙ РАБОТЫ БЕЛДРЭС

На першай Белдрэс імя **Сталіна** я працую з жнулага года. Участак маёй работы (дзяжурны інжынер станцыі) вельмі адказны. У часе дзяжурства я адказваю за бесперабойную работу станцыі. Улічваючы ўсю сур'ёзнасць ускладзеных на мяне, як на дзяжурнага інжынера, абавязкаў, я іх выконваю добрасумленна.

Галоўную ўвагу я звярачаю на правільнае абслугоўванне ўсіх агрэгатаў, дакладную і бесперабойную іх работу. У даным выпадку ад мяне патрабуецца ў першую чаргу—своечасова выпрадкваць дэфекты ў рабоце механізмаў, бо малейшая неспраўнасць можа выклікаць выхад агрэгата са строя, а значыць нарушыць нармальную работу станцыі.

З гэтай адказнай задачай я таксама спраўляюся.

Вось не так даўно ў часе аварыйнага стаяновішча з аналам, бункеры засталіся пустымі, без торфа. У выніку агрымалася мощнае дымленне. Не было ніякай магчымасці падаваць у бункеры торф, што пагражала астаноўкаю станцыі. **Я тут-жа дала рабочым супрэцьгазы і торф падалі. Такім чынам аварыя была папярэджана.**

Другі выпадак. Прыпоўшы на дзяжурства, пры агляде станцыі я заўважыла, што дымасос катла працуе ненармальна (вібраваў рататар і моцна пагураваўся). Гэта пагражала астаноўкаю дымасосу, а значыць і разгрузцы станцыі, бо наближаўся вячэрні максімум. Я зараз-жа заявіла аб гэтым начальніку станцыі. **Тут-жа ды масос быў папраўлен і станцыя працавала далей нармальным ходам.**

Зараз наша станцыя не задавальняе спажыўцоў патрэбнай колькасцю электраэнергіі, што, безумоўна, выклікае вялікія перабоі ў рабоце прадпрыемстваў. Бясспрэчна, шмат віны ў гэтым падае на нас самых. Мы несвачасова робім рамонт катлоў. **Да рамонта катла № 2 трэба было прыступіць 18-га верасня,** аднак ён яшчэ і зараз не рамонтуецца.

Вось чаму задача кожнага інжынера і тэхніка Белдрэс — прыняць усе меры, прыкласці ўсю энергію, каб своечасова рамонт катлоў па ўстаноўлены ўрадам тэрмін, каб у чацвертым квартале наша прамысловасць працавала без перабояў.

Асабіста я, уключаючыся ў перадкастрычніцкую пераклічку, абвешчаную газетай **«Звязда»**, абавязваюся, зарача выканання сваіх штодзённых абавязкаў, **прымаць таксама актыўны ўдзел у рамонце катлоў. Штодзенна пасля свайго дзяжурства абавязваюся дзве гадзіны, а таксама і ў выходныя дні працаваць непасрэдна па рамонту катлоў, звяртаючы галоўную ўвагу на якасць рамонта.**

Як сакратар комсамольскай ячэйкі, бяру на сябе абавязак мабілізаваць усіх комсамольцаў ячэйкі цеплавога цэху на непасрэдную дапамогу ў работах па рамонту катлоў.

Мы павінны ва што-б там ні стала забіцца бесперабойнай работы станцыі і забяспечваць нашых спажыўцоў—фабрыкі і заводы—добраякаснай энергіяй.

Калі скончыцца цеганіна?

(Ліст работніцы)

Да апошняга часа я працавала на Бабруйскай швейнай фабрыцы імя **Дзяржынскага** ў якасці работніцы. На вытворчасці лічылася лепшай ударніцай. За час працы дала многа рацыяналізатарскіх рабочых прапаноў. Фабком камандіраваў мяне, як ударніцу, на вучобу ва ўсебеларускую школу **прафруху.**

На вучобе ў школе я таксама лічылася ўдарніцай. Скончыла яе з найлепшай характарыстыкай і зараз-жа пасля скончэння пашла ў распараджэнне **ЦП саюза швейнікаў.** Тут мяне сустрэлі не зусім добра.

Школьні я скончыла пры школе факультэт сацстраха і працы мяне запэўнілі ў ЦП, што скарыстаюць на гэтай спецыяльнасці. З абяцанкай я прасядзела некалькі тыдняў, але накіравання па працу не атрымала.

Потым прэзідыум ЦП накіраваў мяне на працу культработнікам **Магілёўскай** швейнай фабрыкі-Калі-ж я прыехала на месца, дык там вольнай вакансіі па культпрацы не аказалася і я вымушана была вярнуцца назад.

Вось ужо праходзяць 2 месяцы як я хаджу без работы. Бюракраты з ЦП саюза швейнікаў т. т. **Фіш і Грэк** штодзённа кормяць абяцанкамі. На працягу двух месяцаў пенсіі мне ніхто не выплачвае і я пазбаўлена магчымасці атрымання прадуктаў.

Мар'ясіна.

Якасць абмалота вызначае вагу працадня

Абмалаціць ураджай своячасова і без страт—адна з важнейшых умоў барацьбы за права ўдзелу ў з'ездзе перадавых калгасаў Ленінградскай вобласці

НА СТАГАХ САЛОМЫ... БУЙНАЯ РУНЬ

ЛЕЗНА. (Ад нашага спец. кар.)

Шмат ільну не простага, а селекцыйнага ў калгасе **«Новая праца»**, Стасеўскага сельсавета. Увесь ён—на палях, на тугнах ляжыць нямалочаны. Высах добра, галоўкі аж звіняць. Чаму-ж не звозяць гэты лён у памяшканні, чаму не дзе малацьба селекцыйнага ільну, насенне якога цэніцца на вагу золата?

У калгасе малоцяць жыта, а раз дзе малацьба жыта—«няма калі» малаціць лён. Чарга для ільну яшчэ не наступіла, хай пачакае, пакуль...

Спынімся на малацьбе жыта і пакажам, што значыць гэта «пакуль».

Першая брыгада (брыгадзір **Ганчароў**)... На таку шмат людзей. Перапынак.

Пад'яжджаем да малацьбітоў, спыняемся, гутарым:

— Як малоціцца, ці чыста?

— Лічога сабе, чыста,—адказваюць малацьбіты.

Адказ зразумелы: хто-ж асмеліцца сам ахаяць сваю работу, выставіць на ганьбу перад чужымі людзьмі?

Зрокам аквідаем вялікія, складзеныя абы як стагі саломы. На стагох—буйная руць.

Звачаем па гэта ўвагу малацьбітоў, старшыні сельсавета тав. **Кажунова,** які тут прысутнічае. Кажуноў хвалюецца:

— Як магло так здарыцца! я-ж загадваў, я-ж...

Лезе Кажуноў на стог, раскрывае верх і знаходзіць густыя парасткі жыта, што засталося ў каласох пасля малацьбы. Прапануем таксама калгаснікам, калгаснікам, перажанацца ў тым, якія вялікія страты дапушчаны.

Паміж Кажуновым і калгаснікамі адбываецца гутарка:

Якая-ж будзе вага працадня пры такой якасці работы?

— Ну, што-ж мы зробім, калі брыгадзір **Ганчароў** нікуды не варт..

Справа не ў адным брыгадзіры, які бясспрэчна за нядбайную малацьбу нясе найбольшую адказнасць. Вінавата і праўленне калгаса (старшыня Салаўёў), вінават і сельсавет за сваё адміністраванне, неканкрэтнае кіраўніцтва і адсутнасць дапамогі, вінават вытворчы ўчастак МТС (загадчык **Язычэнка,** аграном **Каткоў**).

Але не менш вінаваты і самі калгаснікі і калгасніцы, якія працуюць на ганьбу перад чужымі людзмі? што стагі саломы робяцца зялёнымі?

Чаму дапушчаны такія страты пры малацьбе ў калгасе «Новая праца»?

Па-першае, у параконную малатарню запраглі дзве пары коняй, далі машыне празмерную нагрузку; падругое, дзка не апушчана нізка да барабана малатарні; па-трэцяе, салома добра не вытрасаецца, стагі складзены каля саміх дзвярэй пуні: э-пад малатарні салома кладзецца проста ў стог. Вось аснoўныя прычыны страт.

Бачылі іх калгаснікі? — **Бачылі.**

Віна сельсовета і кіраўніцтва МТС ў тым, што кіраванне малацьбой спынялася на старшыні калгаса і брыгадзіры і не даходзіла да барабана малатарні, да абмалочанага жаласка збожжа, да зерня, якое прарасло ў стагах.

Стагі абмалочанай саломы, пакрытыя буйнай руннёю ў брыгадзе № 1 калгаса «Новая праца»—не адзіны выпадак: тое самае і ў брыгадзе № 2 (брыгадзір **Князеў**).

Руць на стагах саломы абойдзецца калгасу, па грубых падліках, стратамі 10 проц. ураджаю. Гэта моцна ўдарыць на вазе працадня.

Сігнал з калгаса **«Новая праца»**—сур'ёзны сігнал для ўсяго раёна. Неабходна прыняць тэрміновыя меры да знішчэння выпадкаў малацьбы з вялікімі стратамі, жорстка караючы канкрэтных вінаватых, па-большэвіцку арганізуючы працу.

А. Мікуцкі.

Не аслабляць барацьбы са стратамі

(ПАВОДЛЕ ЛІСТОЎ СЕЛЬКОРАЎ).

Сотні калгасаў БССР па-большэвіцку, без малейшых страт убралі багаты ўраджай гэтага года, абмалацілі яго, разлічыліся з дзяржавай і МТС і забяспечылі значна большую колькасць збожжа на працадзень у параўнанні з леташнім годам.

Разам з гэтым мы павінны адзначыць, што ў многіх нашых раёнах у апошнія дні пачасціліся з'явы пра цілоглага парадку. Раённыя і мясцовыя работнікі пад уплывам добрага ўраджая аслабілі пільнасць у барацьбе са стратамі збожжа.

У апошнія дні ў рэдакцыю ўсё больш і больш паступае сігналаў ад селькораў аб тым, што збожжа гніе на палях, збожжа пры абмалоце ідзе ў салому і г. д.

Селькор **Наханаў з Дубровенскага** раёна паведамляе:

«На палях калгаса імя БЛЮХЕРА, Сваташыцкага сельсавета стаіць у снопах жыта з 10 гектараў і пшаніца з 6 гектараў. Збожжа пачало гніць. Абмалочанае жыта ссыпана ў свірны сырым, псуецца.

Праўленне гэтага калгаса праводзіць яўную кулацкую лінію. Была поўная магчымасць убраць збожжа без малейшых страт, але-ж члены праўлення ў гарачыя дні самі дэзарганізуюць калгаснікаў. Яны пайшлі касіць сена для сваіх уласных патрэб. Калгаснікі пайшлі следам за праўленцамі. Праўленне па-кулацку авансуе калгаснікаў збожжам — па пуду на кожную гаспадарку. Аб усім гэтым піша тав. Наханаў і просіць прыняць меры, бо сельсавет і парт'ячэйка нічога не робяць, каб пакараць ініцыятараў кулацкіх спраў.

Другі селькор з **Дзяржынскага** раёна **П. Куколь** піша:

«У калгасе «БЕЛАРУСЬ», Возерскага сельсавета, сцірты жыта і па сёнешні дзень не завершаны. Жыта парасло. Калгас церпіць мінімум 200 пудоў страт па віне палявода БЫКОЎСКАГА. Кулацкі агент БЫКОЎСКІ робіць усё, што можна, каб толькі пашкодзіць калгасу. Ён дазволіў збіраць каласы ячменю ўсім, каму не лень для ўласных патрэб».

Яшчэ больш абуральчыя справы творацца ў **Пухавіцкім** раёне. Селькор **З. Б.** паведамляе:

«У калгасах імя ЧАРВЯКОВА, «СТАЛІНЕЦ» і «СІЛАЧ» гніе на палёх 10 гектараў пшаніцы, 5 гектараў ільну, 8 гектараў ячменю, гарох, віка і канюшына».

У калгасе імя ЧАРВЯКОВА пры абмалоце 40 гектараў жыта ў сапоме засталося да 500 пудоў збожжа, г. зн., больш 10 пудоў з кожнага гектара».

Брыгада студэнтаў з **Горацкага** раёна піша вось што пра малацьбу ў калгасе **«Шлях соцыялізма».**

«За чыстатой абмалота ніхто не глядзіць. Збожжа ідзе ў сапому і мякіну. Паводле прыблізных падлікаў, страты пры ўборцы і абмалоце роўны 175 цэнтн. збожжа. На кожны працадзень калгаснікі недатрымаюць 1,75 кгр.».

Ясна, што гэта — справа рук кулацкіх элементаў. Малацьба — адзін з адказных момантаў у цыкле сельска-гаспадарчых работ. Недарма класава-варожыя элементы накіроўваюць сюды свае брудныя рукі, каб пусціць збожжа ў салому і знізіць каштоўнасць працадня.

Усе гэтыя факты сведчаць аб адным. Партарганізацыям патрэбна яшчэ больш павысіць класавую пільнасць па калгасных палях і таках. Бо аслабіць барацьбу са стратамі ў даны момант гэта значыць — звесці на нішто большэвіцкія перамогі, якіх мы дабіліся сёлета на фронце ўраджайнасці.

Патрэбна ўбраць з поля ўсё да апошняга зерня збожжа. Выкарыстаць усе магчымасці ў калгасах для сушкі збожжа, мабілізаваць еўні і гумны.

Далейшае накіданне на полі снапоў—ганьба для калгаса і раёна.

ПАБУДУЕМ ЭСКАДРЫЛЬЮ ІМЯ тав. КАГАНОВІЧА

Адстаючых—на гра мадскі буксір

Перадавыя раёны па эборы сродкаў на пабудову эскадрыльі імя Кагановіча ў мэтах хутчэйшага завяршэння кампаніі бяруць НА ГРАМАДСКІ БУКСІР АДСТАЮЧЫЯ РАЁНЫ:

ОРША бярэ на буксір **Талачын і Чашнікі.**

СМАЛЯВІЧЫ — Магілеў.

МЕНСК — Асіпавічы і Заслаўль.

ГОМЕЛЬ — Уваравічы, Буда-Кашалёўскую і Ветку.

ВІЦЕБСК — Гарадок, Сіроціна і Сураж.

Раўняючыся па перадавых раёнах, скарыстаўшы іх вопыт, адстаючыя раёны павінны хутчэйшым завяршэннем збора сродкаў заваяваць месца ў радах перадавікоў.

На бягучым рахунку 920.929 руб.

За 3-е кастрычніка па бягучы рахунак Дзяржбанка № 160-7.814 паступіла 8.346 руб. Ад арганізацый і ўстаноў гор. **Менска**—343 руб. 3 раёнаў: **Пухавіцкага**—2.281 руб., **Петрыкоўскага**—1.125 руб., **Мазырскага**—1.084 руб., **Старобінскага**—951 руб., **Чашніцкага** — 707 руб., **Быхаўскага** — 247 руб., **Асвейскага** — 448 руб., **Дубровенскага** — 134 руб., **Дрысенскага** — 165 руб., **Жлобінскага**—137 руб., **Чачэрскага** —276 руб., **Чэрвеньскага**—72 руб. і **Буда-Кашалёўскага**—374 руб.

З пачатку збора на бягучым рахунку—920.929 руб.

Уносяць і выклі

*) На выклік т. **Кляшчова** ды тар бешанковіцкай МТС т. **А** унёс на пабудову авіаэскадрыльі т. Кагановіча—20 руб. Грошы ведзены на бягучы рахунак Дзяр банка.

*) Выклік т. **Чавускага** я, Г нік Белкаапсаюза, прымаю. У на пабудову эскадрыльі 15 руб. клікаю т. т **Царонка, Бу** **смана, Іпатава, Барзуна,** **Сульніну, Каждана, Левіта,** **Блюмкіна** (Белкаапсаюз), **Па** ша) і **Рабоўскага** (Рагачоў).

КАР

ЗМАГАЦЦА З СКРЫЎЛЕННЯМІ СОВЕЦКАГА ГАНДЛЮ

Агляд рабселькораўскіх лістоў

Матэрыялы з месц гавораць, што многія райспажыўсаюзы і сельспажыўтаварыствы адсталі ад жыцця і працуюць старымі, даўно асуджанымі мэтадамі.

Брыгада друку: т. т. **Кейгельс, Рыжанкоў, Літок і Хадзянкоў** паведамляе, што **Горацкі** райспажыўсаюз ігнаруе дырэктыву аб перабудове працы па-новаму і практыкуе недапушчальныя мэтады работы.

«Дагавары з калгасамі заключаны фармальна, іх выкананне не правяраецца. Калгасы не снабжаюцца таварамі, паліцы ўдарнікаў па ССТ пустуюць. Ёсць толькі адна шыльда «паліца ўдарніка».

Старшыня райсаюза **Сурпін** даў распараджэнне ўсім сельспажыўтаварыствам ўжываць прымусовы асартымент. Сельспажыўтаварыствы выконвалі гэта распараджэнне.

«Хто жадаў купіць поўлітра гарэлкі, павінен быў набыць таксама іржавыя вілкі і пудру на 4 рублі».

Аб тым, што спажывецкая кааперацыя Горацкага раёна вельмі дрэнна абслугоўвае калгаснікаў і аднаасобнікаў, сведчыць і той факт, што на працягу некалькіх месяцаў у раёне не было запалак і солі. Быў такі час, калі райсаюз атрымаў невялікую колькасць солі, дык загадчык сектара снабжэння **Луста** прапанаваў усім ССТ спагнаць па тры рублі паявых узносаў за кожнае кіло солі.

Брыгада паведамляе таксама, што ў кааперацыі панае просты тавараабмен.

«Сектар снабжэння адпусціў Дрыбінскаму сельспажыўтаварыству махорку і цукеркі з умовай выдаваць іх у абмен на сала і масла».

Т. т. **Бардзенка і Адашкевіч** пішуць, што Дзяржынскі райспажыўсаюз тармозіць выкананне плана тавараазвароту. Ён не стымулюе ўдарную работу паасобных загадчыкаў крам. Загадчык цэнтральнай крамы № 1 Рубілкаўскага ССТ **Сікорскі** зрабіў за месяц тавараазварот у 9.322 руб. і атрымаў пансіі — 66 руб. Загадчык крамы № 2 **Кешановіч** зрабіў за жнівень тавараазварот у 2.528 рубл. і атрымаў 52 руб.

«Замест таго, каб выдаваць сельспажыўтаварыствам лепшы асартымент тавараў, Дзяржынская райбаза адпускае прыязджаючым прадстаўнікам сельспажыўтаварыстваў няходкі тавар, а лепшы пакідае для гарспажыўтаварыства».

Нядаўна прадстаўнік Рубілкаўскага ССТ Сікорскі выбраў на базе тавары для кааперацыі. Загадчык снабжэння Дзяржынскага райсаюза т. **Сасноўскі** не выдаў готых тавараў ССТ, а навязаў яму мануфактуру горшай якасці. Гэта яўны падыў гандлёвай работы пізоўкі.

— Хіба соль і запалкі сталі ў-нас дэфіцытнымі таварамі, — пытаецца ў лісце ў рэдакцыю т. **«Зоркі».** Ён правільна падкрэслівае, што

«гэтыя тавары можна атрымаць у дастатковай колькасці, калі праявіць належную ініцыятыву і ўменне працаваць. А вось Чашніцкі райспажыўсаюз, які павінен забяспечыць калгаснікаў і аднаасобнікаў патрэбнымі таварамі, не прымае ніякіх мер да завозу солі і запалак».

Т. т. **Чэрнін і Эльнер** у сваёй карэспандэнцыі характарызуюць работу сельспажыўтаварыстваў Гомельскага раёна.

«Лепшымі з'яўляюцца Ўлукаўскае і Жгунскае сельспажыўтаварыствы. Старшыні іх т. т. КРАСНІЦКІ і ЛАПТУХОЎ дабіліся перавыкнання планаў тавараазвароту. Іншыя сельспажыўтаварыстры праяўляюць бюракратычную непаваротлівасць і няўменне перабудаваць работу. Бабовіцкае сельспажыўтаварыства напа план тавараазвароту на 5 і сабрала паявых узносаў 1 Тавары затрымліваюцца ў Астача перавышае норму бо чым у два разы».

У Зябраўскім сельспажыўтаварыс Гомельскага раёна, паведамляюць т таварышы, — крама ў разгар уб была закрыта, ні разу крамнік не яжджаў з таварамі на поле.

Многія спажыўтаварыствы забы ваюць, што абстаноўка на вёсцы рэзка змянілася, што сумленная ная праца калгаснікаў забяспечы магчымасць значна лепш задав свае матэрыяльна-бытавыя і куль ныя запатрабаванні. А гэта нака асабліва адказныя абавязкі на лёвую сетку.

Аб росце матэрыяльна-бытавы рабаванняў рабочых мас частаваюць і гарадскія гандлёвыя ар цы. Тав. **Н. Ш. БЕРНШТЭЙН** у карэспандэнцыі правільна ска на ізнаравание кааперацыяй по пайшчыкаў. Зірніце ў менскія ар ЗРК і Белгандля. Вы апойдзеце жаночых панчох, а вось мужч шкарпетак підзе няма. Гэта сведч аб дрэнным планаванні завоза тав аб нежаданні ўлічваць попыт спа ца.

Той-жа тав. **Бернштэйн** адзнача здавальняючае становішча з га гародніцай. Многія крамы куп між тым, ураджай гародніны ба Чаму кааперацыя не паклапаці своячасова заключыць дагавары з гасамі і забяспечыць падвоз гаро з прыгарадных гаспадарак? Гэта танні заслугоўваюць вялікай увагі характарызуюць пекаванне нашае звеніну кааперацыяй і гортваць совецкі гандаль.

Юрка ЛЯВОННЫ

Чычыкавы з „Перамогі"

Гэты дзень будзе доўга ўспамінацца праўленнем калгаса «Перамога», Мсціслаўскага раёна, як дзень найвялікшай гаспадарчай удачы. Кіраўнікі «Перамогі» сапраўды «пераматлі» ў гэты дзень!

Невядома, што тут адыграла рашаючую ролю: гандлярская спадчынасць па лініі бацькоў ці непасрэдна «благатворнае» раней навыкі, але непакойны дух камерцыі вітаў у гэты дзень над праўленнем калгаса «Перамога». Спакусіў-жа Іван Канаваленка, загадчык мясцовай кааперацыйнай крамы.

Бліскучая ідэя скупляння прададзён прышла ў галаву Івану Канаваленка так-жа імкнення і нестрымана, як тогалеўскаму Павлу Іванавічу Чычыкаву ідэя скупляння мёртвых душ. Але праўленне калгаса «Перамога»—гэта не далікатны «выспы свет» губернскага горада Н.—і поваяўлены Чычыкаў рашыў дзейнічаць напрасцень, шчыра. Пачалося на кватэры ў Івана Канаваленкі. Пачалося з літра, працягвалася цэлай чвэрцю (праўленне было на галаву моцнае!), а калі адшаведная колькасць перайшла ў належную якасць—загадчык крамы абвясціў рапуча і непахісна:

— Вы, гэта значыць праўленне, на вінны прадаць мне некалькі дзесяткаў працадзён. Зразумела? Справа чыстая і камерцыйна выгодная: я вам—наяўныя грошы, вы мне—паяўныя працадні!

— Прадаць працадні?—зацікавіліся выгоднай справай кіраўнікі «Перамогі».—Гэта можна... Чаму-ж не прадаць? Толькі якая на іх цана цяпер? Тавар ходкі, мы прадзешавіць не збіраемся!

— Не клапаціцеся, я вас не пакрыўджу... А працадні вам ўсёроўна без ужытку: не з кішэні-ж выкладваць! Дык па руках?

— Па руках!

Такім чынам Іван Канаваленка пабыў за 45 рублёў 30 калгасных працадзён... І атрымалася, як у прыказцы—«і воўкі сыты і авечкі цэлы», бо ідучы не зусім цвёрдымі нагамі, з пустымі ад загадчыка крамы, праўленцы шумна і весела выйшлі сваю радасць з повазу ўдалае камерцыі:

— Ну і дурань Іван... Ік!.. Ну, і няўлюддзе. Ік!.. Во аблапошылі мы чалавека — ажно пяёмка! За пейкія нікім непрацаваныя дні—яшчэ і грошы атрымалі... Ік!.. І знайшоўся-ж дзівак!...

Неўзабаве ў калгасе абгуль ны сход і расчулены дабротай і п насцю Івана Канаваленкі старо праўлення **Вераб'ёў** заявіў на ім, ў Івана—8 душ сям'і і яму трэба даць за паяўны разрахунак 365 п падзён... За мудрую прапанову ўп ліся 9 няўпэўненых рук, **устрымал 50,** але паколькі супроць галасаван не адважыліся—прапанова была ўхв лена.

Навучаны ўдалым прыкладам к ператара, да праўлення «пат'ёх» яшчэ адзін скупшчык неадпрацаваны дзён—масларов Шыжкароў. Але т праўленне мела ўжо вопыт і адра запрасіла з другога Чычыкава 1 рублёў за 30 дзён (каб не прадзе віць!).

Масларов аказаўся больш скнар сты, як загадчык крамы, і ў іх глебе камерцыі завязалася спрэч якая здаецца цягнецца да сёння дзень. А пакуль ідзе спрэчка і пра ленне «Перамогі» выгандлёўвае «мёртвых» прададзіных, справамі Р раб'ёва і «прысных», трэба спадзя ца, зацікавіцца, парошце, пракур тура і суд.

Юрка ЛЯВОННЫ

ЗА БОЛЬШЭВІЦКІ ПАРАДАК НА АЎТАТРАНСПАРЦЕ

Аўтамабіль патрабуе праверанага і вопытнага вадзіцеля

«У нас не было аўтамабільнай прамысловасці. У нас яна ёсць цяпер». (Сталін).

Да рэвалюцыі ў Расіі не было вытворчасці аўтамабіляў. На працягу першай пяцігодкі Совецкі Саюз набудаваў улас ную аўтамабільную прамысловасць і выпускаў 57.800 аўтамабіляў. За 8 месяцаў 1933 года з канвейера трох заводаў спушчана [illegible] аўтамабіляў, выраблены з [illegible] матэрыялаў.

Гігантскія тэмпы развіцця аўтатранспарта выкладваны ў другой пяцігодцы. На 17 партканферэнцыі т. **Молатаў** ука заў, што **«ў другой пяцігодцы упершыню пачне большэвіцкімі тэмпамі развівацца наш аўтамабільны транспарт. Гэта відаць хоць-бы з таго, што перад канцам пяцігодкі штогадовы выраб аўтамабіляў будзе не менш 300-400 тыс.».**

Скончыўшыся аўтапрабег Масква-Каракум—Масква, які па сваіх маштабах не мае сабе раўнага ў гісторыі аўтамабілізма—бліскучая перамога палітыкі індустрыялізацыі большэвіцкай партыі, доказ тэхнічнага роста краіны і вялізарных дасягненняў нашай маладой яшчэ аўтамабільнай прамысловасці.

Гэта асабліва ярка выяўляецца на фоне заняпаду аўтамабільнай прамысловасці капіталістычных краін, дзе крызіс прымусіў звярнуць рад аўтапрадпрыемстваў. Нават у такой краіне аўтамабілей як Амерыка, за годы крызіса вытворчасць аўтамабілей скарацілася ў чатыры разы. Выдатны аўтамабільны король **Форд** прымушан быў [illegible] усе свае заводы ў Англіі і [illegible] вытворчасць у Аме- [illegible] годам усё больш узрастае [illegible] парта ў социялістычнай [illegible] гаспадарцы.

[illegible] Тэхнічная ра- [illegible] звяза ная з механізацыяй усіх аспоўных вытворчых працэсаў, патрабуе шэлізарнай колькасці розных машын. Сярод машын, адыгрываючых рашаючую ролю ў перабудове сельскай гаспадаркі па социялістычны лад, адно з першых месц пасля трактара належыць аўтамабілю.

Расце аўтамабільны парк і ў БССР. У 1929 г. налічвалася не больш 200 машын, якія ў большасці пабывалі ўжо ў капітальным і аднаўленчым рамонце. Тое, што гэтыя машыны былі ста розных марак і сістэм, не давала магчымас ці арганізаваць больш-менш правільную аўтагаспадарку.

З 1932 г. пачаўся планавы завоз у БССР машын совецкіх марак і ў сучасны момант аўтапарк рэспублікі налічвае ўжо звыш тысячы штук.

Несупынны рост аўтамабілізацыі народнай гаспадаркі Беларусі і ўсё ўзрастаючыя патрабаванні да аўтатранспарта вымагаюць узорнай і найбольш эфектыўнай эксплаатацыі, бярэжлівых адносін і штодзеннага догляду за кожнай машынай.

Што-ж мы маем у сістэме эксплаатацыі аўтатранспарта? Ці палепшыліся выкарыстанне машын, іх тапажа? Ці дае аўтатранспарт тую эксплаатацыйную магутнасць, на якую ён разлічан?

На жаль, не. Адна з прычын гэтага—выключная раздробленасць і распылёнасць аўтагаспадарак. На Беларусі на 1.000 з лішкам машын ёсць 470 аўтагаспадарак, г. зн. што ў адной аўтагаспадарцы ў сярэдзіне ёсць ня 2 машыны. А калі адкінуць такія буйныя арганізацыі, як Галоўдартранс, Белдзяржтранс, то аказацца, што большая частка аўтагаспадарак мае толькі па адной машыне. Ва ўсіх гэтых 470 гаспадарках поўны розабой.

Ва многіх дробных аўтагаспадарках, машыны усяго на адной машыне, існуе тэндэнцыя мець у сябе свой гараж са сваімі механікамі і майстэрнямі, што, зразумела, не з'яўляецца рэнтабельным.

Процант выкарыстання машын і іх тапажа вельмі нізкі. У рабоце знаходзіцца толькі 55 проц. парка. Замест нармальных 30 тыс. клм. прабега, яны часта патрабуюць капітальнага рамонта пасля 5-6 тыс. клм. А **якасць** рамонта ў такіх гаражах, дзе з інструментаў ёсць толькі адны... ціскі, настолькі нізкая, што машына не паспявае прайсці некалькі сот кілометраў, як зноў пападае ў рамонт. Па ўсёй Беларусі толькі адна Гомельская майстэрня здольна прапусціць праз рамонт значную колькасць машын. Але і гэта майстэрня працуе бясплаладна, работа ў ёй не арганізавана, што дрэнна ўплывае на якасць рамонта.

Транспарт адчувае вялікі недахват аўтаабутка. Завоз гумы задавальняе па трэбу рэспублікі на 30-40 проц. Пры такіх умовах трэба правяць максімум бярэжлівасці ў выкарыстанні пакрышак і камер. Гэтага няма. Наадварот, ёсць факты, калі пакрышка замест нармальнага прабега ў 10-12 тыс. кілометраў, праходзіць толькі 1-2 тыс. клм. (саўгасы Купцічы, Замосцо) і становіцца сняготнай.

Гэта ўсё залежыць ад шофера, ад умоў захавання і якасці рамонта ў вул канізацыйных майстэрнях. Найбольш буйная ў БССР—Менская вулканізацыйная майстэрня—не можа абслужыць усё узрастаючыя патрэбы аўтатранспарта. Майстэрня вядзе сваю работу саматужным чынам і нават не мае належнага памяшкання. Таму пытанне аб пашырэнні сеткі вулканізацыйных майстэрняў па буйных гарадох патрэбуе найбольш хуткага вырашэння.

Недахопы эксплаатацыйнай службы, павышаны расход запасных частак [illegible] ляў, гаручага, гумы кла[illegible] вялікіх [illegible] аўтаперавозкі. Да гэтага часу кожная транспартная арганізацыя бярэ за перавозку колькі ёй захочацца—ад 6 да 20 руб. за гадзіну. Вельмі часта пры да стаўцы некаторых тавараў шырспажыва па вёску кошт аўтаперавозак у некалькі раз перавышае адпускныя цэны. Амаль ні ў адной галіне народнай гаспадаркі няма столькі скажэнняў гоўскай палітыкі цэн, як па аўтатранспарце. Бескантрольнае гаспадарчанне на рынку перавозачных сродкаў нарадзіла на аўтатранспарце модныя пра ны гандлярскага духу.

Неабходна як мага хутчэй выпрацаваць адзіны тарыф на аўтаперавозкі. Гэта з'явіцца важным мерапрыемствам для аздаравлення аўтатранспарта, ліквідацыі існуючай ваканалі цэн і ўмацавання гаспадарчага разрахунка. **Трэба забяспечыць зніжэнне сабекошта перавозак і правядзенне выразнага гас падарчага разрахунка на транспартных прадпрыемствах.**

Пытанне **аб кадрах** аўтатранспарта, аб людзях, якія сядзяць за совецкай машынай—актуальнейшае пытанне сёнешняга дня. **Аўтамабіль патрабуе вопытнага праверанага вадзіцеля.**

Яшчэ ў ліпені мінулага года ЦК УсеКП(б) у спецыяльнай пастанове аб шоферскіх кадрах падкрэсліў, што важнейшай задачай у справе палепшэння эксплаатацыі аўтатранспарта, з'яўляецца падбор і падрыхтоўка кадраў.

ЦК партыі тады канстатаваў, **«вельмі нізкую кваліфікацыю шоферскіх кадраў і нездавальняючасць арганізацыі падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі шофераў, вялікую цякучасць, надзвычай нізкае становішча працдысцыпліны (рост прагулаў, п'янкі і аварыйнасць) і засмечанасць асобных аўтагаспадарак класава-чужымі элементамі».**

У пастанове быў даны зусім канкрэтныя ўказанні аб ліквідацыі недахопаў на гэтых важнейшых участку аўтатранспарта. Аднак, дырэктывы ЦК да гэтага часу ў Беларусі застаюцца невыкананымі. Транспартныя арганізацыі і ў прыватнасці, Галоўдартранс на [illegible] маюцца падрыхтоўкай кадраў, павышэнем іх кваліфікацыі. Сродкі на гэту мэту застаюцца невыкарыстанымі. Загадчык кадраў Галоўдартранса тав. **Кавалёў** лічыць, што яго справа рыхтаваць толькі дарожнікаў. Між тым **пераважная колькасць аўтаработнікаў мае нізкую кваліфікацыю.** З 2.000 шофераў толькі 12 проц. першай катэгорыі, 27 проц. другой катэгорыі, рашта трэцяй катэгорыі. У **Гомелі** з 57 шофераў — першай катэгорыі толькі 8. Гэта ў той час, кал

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

Па 3-га верасня паўнамочным прадстаўніцтвам СССР у Берліне атрымана ад германскага міністэрства замежных спраў вербальная нота ў адказ на пратэсты совецкага паўпрадства ў Берліне і ў сувязі з рашэннем совецкага друку аб адкліканні з Германіі сваіх прадстаўнікоў і пастановай саюзнага ўрада аб спыненні дзейнасці германскіх журналістаў у СССР.

У ноце абыходзіцца маўчаннем шматлікія выпадкі здзекаў і паліцэйскіх праследаванняў супроць прадстаўнікоў совецкага друку, на якія ўказвала нота народнага камісара тав. Літвінава, і робіцца спроба растлумачыць совецкія мерапрыемствы выключна выпадкам арышта совецкіх журналістаў у Лейпцыгу.

Як нам удалося высветліць, германская вербальная нота зрабіла не лепшае ўражанне ў совецкіх урадавых колах. Там думаюць, што калі ўрад германскі ўрад прыпісваў поўныя дзеянні германскіх улад іх «нецыплінаванасці», выказваючыся аб гэтых дзеяннях непахвальна, дык ён зноўнай вербальнай нотай ён як-бы пакрывае гэтыя дзеянні і трымае за іх поўную адказнасць, і што такая пазіцыя поўнасцю пацвярджае правільнасці і немінучасць вываду, зробленых совецкім урадам.

ПАВАТ ЯНЫ ВЫМУШАНЫ ПРЫЗНАЦЬ

ВЕНА. (БЕЛТА).

Па думцы органа нацыянал-царатаў «Луга», ход судовага следства па справе аб падпале рэйхстага, рэзультаты контр-працэса ў Лондане, а потым паказанні чатырох падсудных комуністаў у Лейпцыгу зрабілі такое ўражанне на сусветную грамадскую думку, што суд ў Лейпцыгу ўжо не можа вынесці ім абвінаваўчы прыгавор, не пакрыўшы сябе ганьбой.

ЗВАЛЬНЕННЕ 22 ГЕРМАНСКІХ ПРАФЕСАРАЎ

ПРАГА, 2. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Берліна, у радзе універсітэтаў і тэхнічных ВНУ Германіі зноў звольнены 22 вядомых прафесары з прычыны іх ідэйскага пахіснення або палітычнай ненадзейнасці.

ЗАТРУДНЕННІ НАНКІНСКАГА УРАДА

ШАНХАЙ. (БЕЛТА).

Учора ў газетах было паведамлена, што Ван Цзін-вей падаў у адстаўку і што яго прыкладу намеран паследаваць Сун Цзе-вень.

Гэтыя чуткі былі афіцыяльна абвергнуты.

Сёння ў Шанхаі адбылася нарада ўрадавых дзеячоў пры ўдзеле Ван Цзін-вея, Сун Цзе-веня і Сунь-по. Указваюць, што нанкінскі ўрад перажывае вялікія фінансавыя затрудненні ў сувязі з велізарным бюджэтным дэфіцытам і немагчымасцю выйсці рэалізаваць на ўнутраным рынку бавоўну, атрыманую ў ПАЗШ у парадку пазыкі.

МОРСКАЯ КАТАСТРОФА У ЯПОНІІ

ТОКІО, 2. (БЕЛТА).

1-га кастрычніка, недалёка ад японскага порта Міоумі з прычыны перагрузкі перавярнуўся параход са 162 экскурсантамі. Затанулі камандa і больш 125 экскурсантаў.

НОВЫ ФАШЫСЦКІ ЗАМАХ НА ПРАВЫ ГЕРМАНСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА

ПРАГА, 2. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Берліна, перавыбары фабзаўкомаў у Германіі, якія ў красавіку ўжо былі адкладзены да кастрычніка, забаронены цяпер у інтарэсах забеспячэння «унутранай бяспечнасці і грамадзкага спакою» да першага студзеня 1934 года.

Гэты новы замах на палітычныя правы германскага пролетарыята мотывуецца тым, што «перавыбары створаць нервовую абстаноўку на прадпрыемствах».

Гэтым нацыянал-сацыялістскія улады адкрыта прызнаюць, што настрой рабочых мае на прадпрыемствах праявлялася знішчальны для нацыянал-сацыялістаў рэзультат перавыбараў. Весь чаму лепш наогул не дапускаць больш выбараў фабзаўкомаў.

У аправедным рашэнні ўрада таварыща, што прыход да ўлады нацыянал-сацыялістаў «патрабуе змянення законаў аб фабзаўкомах» і што гэта змяненне распрацоўваецца.

РАЗГУЛ ТЭРОРА НА КУБЕ

Н'Ю-ЁРК, 2 (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Гаваны (Куба), урад Мартына закрыў памяшканне рэвалюцыйнай федэрацыі працы. Федэрацыя зараз у падполлі і падрыхтоўвае ўсеагульную забастоўку.

Унутры краіны шмат забастовак пратэста супроць расстрэла комуністычнай дэманстрацыі ў Гаване. У Гаване арыштавана 50 комуністаў, у Казаблянка—40 і некалькі сот у іншых раёнах.

Урад адпаўляе на ранейшых пасадах паліцэйскіх афіцэраў, служыўшых пры дыктатуры Маладо. Выдана пастанова аб тым, што на вуліцах не могуць збірацца больш трох чалавек разам.

Як паведамляе «Асошыэйтэд прэс» урадавыя войскі, узброеныя артылерыяй, кулямётамі і вінтоўкамі, атакавалі «нацыянальную тасцінніцу», дзе з моманта зняволення Сэспедэса засеялі 500 афіцэраў—прыхільнікаў ранейшага ўрада. Афіцэры адказвалі агнём. Некалькі чалавек забіта, у тым ліку амерыканец, прадстаўнік мясной кампаніі Свіфта.

ЖЭНЕВА

ГЕРМАНСКІ КОНТР-ПРАЕКТ АДХІЛЕН

ВАРШАВА, 2. (БЕЛТА).

Катэгарычная «Палонія», спасылаючыся на добра інфармаваныя крыніцы, паведамляе, што германскі праект, паводле якога Германія, стаўшчаючыся на кантроль над германскімі ўзбраеннямі, патрабуе разам з тым прадастаўлення ёй права набываць умацаванні ва Усходняй Прусіі і на польска-германскай граніцы, у Жэневе поўнасцю праваліўся.

Супроць праекта выступілі не толькі французскія, але і англійскія дэлегаты, якія адказваюць сур'ёзных усклад пенняў у рэзультаце узмацнення германскіх узбраенняў.

«З прычыны гэтага, — паведамляе «Палонія», — у берлінскіх урадавых колах пастановілі перамяніць тактыку і высунуць новы праект, паводле якога Германія згаджаецца на кантроль узбраенняў пад умовай згоды Польшчы на дэмілітарызацыю сваіх заходніх границ. Гэты праект пібыта будзе ў бліжэйшы час агалошан прадстаўніком Германіі ў Жэневе».

Каментуючы гэтыя чуткі, якія, як падкрэслівае газета, атрыманы з вельмі сур'ёзных крыніц, «Палонія» заўважае:

«Ад рашучай пазіцыі нашага міністра замежных спраў залежыць, у якой меры пераговары аб разбраенні паставяць пад пагрозу нашу бяспечнасць і прэстыж ў Эўропе».

Эрыо аб СССР

ПАРЫЖ, 2. (БЕЛТА).

Эрыо апублікаваў у «Ажанс эканомік фінансэр» вялікі артыкул аб СССР.

«Няма ні адной такой краіны ў свеце,—піша ён,—аб якой у цяперашні момант было-б напісана столькі недарэчнасцей, як аб Совецкім Саюзе. Ва ўсіх гэтых выпадках мае месца зўмыслная палітычны фанатызм».

Падкрэсліўшы, што СССР — пастаянны аб'ект паклёпа замежнага друку, Эрыо заўважае, што неабвержным доказам развіцця СССР служыць велізарны прырост насельніцтва, пачынаючы з 1920 года, і надзвычайнае смяротнасці, асабліва дзіцячай.

Пераходзячы да характарыстыкі совецкай дзяржаўнай сістэмы, Эрыо адзначае, што пры значнай цэнтралізацыі ўлады, насельніцтву СССР забяспечана шырокае мясцовае самакіраўніцтва, развіццё і свабода нацыянальнасцей.

«Адны нацыянальнасці,—піша ён,— ужо абуджаны да жыцця, другія абуджаюцца. Совецкі Саюз аднае зараз 11 рэспублік, 15 аўтаномных абласцей, і гэтым рэспубліканм, абласцям дадзена права культурнай і адміністрацыйнай аўтаноміі...»

Эрыо прыводзіць таксама рад даных, якія паказваюць рост пасеўных плошчаў і поспех калектывізацыі ў СССР. Апісваючы дасягненні ў галіне прамысловага будаўніцтва СССР, ён падкрэслівае значэнне соцпаборніцтва.

У заключенне Эрыо піша:

«Калі дадаць да гэтага, што Совецкі Саюз увёў абавязковае сямігадовае навучанне і стварыў найлепшую армію, дык будзе аразумела, што СССР з гэтага часу становіць сабою выключна важную сілу ў свеце».

«Ом лібр», публікуючы вытрымкі з артыкула Эрыо, характарызуе яго, як «выдатнае, яснае, дакументальнае і выключна аб'ектыўнае даследаванне СССР».

АНТЫВАЕННАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў КІТАІ

ШАНХАЙ, 2. (БЕЛТА).

«Івінг пост» указвае, што, не гледзячы на забарону, антывасная канферэнцыя ўсё-ж адбылася «дасеці ў Шанхаі».

На канферэнцыі прысутнічалі 60 прадстаўнікоў ад правінцый Чахар, Хобей, Манчжурыі, раду іншых правінцый, а таксама совецкіх раёнаў.

Абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з арганізацыяй барацьбы супроць імперыялістычнай вайны.

У прыватнасці было пастаўлена пытанне аб стварэнні на Далёкім Усходзе секцыі сусветнага антываеннага камітэта. Канферэнцыю сёгала Суй Цзі-лін (удава Сун Ят-сена). Даклад аб становішчы на Далёкім Усходзе зрабіў старшыня канферэнцыі Мардей.

Прадстаўнік Манчжурыі ў агляде становішча ў Манчжурыі апісваў актыўнасць кітайскіх партызанаў і ўзрастаючую хвалю барацьбы супроць японскага панавання ў Манчжурыі.

На канферэнцыі выступілі таксама прадстаўнікі рабочых Шанхая, маракі, кулі, якія выказалі жаданне прыняць актыўны ўдзел у антыімперыялістычнай барацьбе.

Прынят текст зварота да ўсіх працоўных Далёкага Ўсхода, а таксама тэзісы рэзалюцыі, у тым ліку рэзалюцыя супроць фашысцкага тэрора ў Германіі і супроць нагрозы імперыялістычнай інтэрвенцыі ў СССР.

СУПРОЦЬ ФАШЫЗМА, СУПРОЦЬ ВАЙНЫ!

АНТЫВАЕННЫ З'ЕЗД У Н'Ю-ЮРКУ

Н'Ю-ЮРК, 2. (БЕЛТА).

Антывасны з'езд закрыўся. Выпрацавана канкрэтная праграма дзейнасці і пастаноўлена арганізаваць пастаянную амерыканскую лігу барацьбы супроць вайны і фашызма з аддзяленнямі на ўсёй краіне.

Делегаты аднадушна ўхвалілі маніфест, які заклікае да барацьбы супроць ваеннай небяспекі і фашызма, на аснове адзінага фронта.

«Чорныя хмары імперыялістычнай вайны навісілі над светам,—гаворыцца у маніфесце.—Масы павінны неад кладна ўзняцца для барацьбы супроць вайны на Далёкім Усходзе і ў лацінскай Амерыцы, супроць інтэрвенцыі на Кубе і ўзрастаючых ваенных падрыхтаванняў».

Маніфест адзначае, што нельга змагацца супроць ваеннай небяспекі, не змагаючыся супроць усякіх спроб аслабіць і знішчыць Совецкі Саюз.

Паводле слоў маніфеста, палітыка ўрада ПАЗШ больш агрэсіўная чым калі-небудзь. Рузвельтаўскі план садзейнічае падрыхтоўцы да вайны і адностроўвае палітыку надзвычайных ваенных бюджэтаў і мабілізацыі прамысловасці.

У прынятай з'ездам рэзалюцыі ён абавязваецца падтрымліваць барацьбу германскіх працоўных і патрабуе вызвалення Торглера і іншых рэвалюцыянераў.

Паслана тэлеграма Рузвельту з патрабаваннем вывада ваенных суднаў з вод Кубы і тэлеграма прэзыдэнту Кубы з пратэстам супроць расстрэла рабочых дэманстрантаў у Гаване.

У з'ездзе прымала ўдзел 2.616 дэлегатаў, у тым ліку 303 ад прафсаюзаў, 147 ад заводскіх камітэтаў, 135 ад беспрацоўных, 130 ад компартыі, 70 ад комсамола, 41 ад фермераў, 364 ад культасветных арганізацый і г. д.

ЗА АДЗІНЫ ПРОЛЕТАРСКІ ФРОНТ

ПАРЫЖ. (БЕЛТА).

Скліканая па ініцыятыве ўсеагульнай унітарнай канфедэрацыі працы канферэнцыя прафсаюзнага адзінства аднагалосна пры двух устрымаўшыхся прыняла рэзалюцыю, якая заклікае ўсіх членаў прафсаюзных арганізацый стварыць адзіны фронт.

Канферэнцыя адзначае, што з'езд рафармісцкай генеральнай канфедэрацыі працы выказаўся за працяг палітыкі класавага супрацоўніцтва і палітыкі раскола сіл пролетарыята, замест барацьбы за адзінства рабочага класа.

Канферэнцыя заклікае ўсіх членаў рэфармісцкіх прафсаюзаў прыняць актыўны ўдзел разам з унітарнымі прафсаюзамі ў класавай барацьбе супроць рэфармізма, фашызма і імперыялістычнай вайны.

* * *

ПАРЫЖ. (БЕЛТА).

Скліканы ўсеагульнай унітарнай канфедэрацыяй працы мітынг прафсаюзнага адзінства для барацьбы супроць фашызма сабраў каля 4 тысяч працоўных усіх палітычных напрамкаў.

Аднагалосна пры 6 устрымаўшыхся прынята рэзалюцыя, якая ўхваляе рашэнне канферэнцыі прафсаюзнага адзінства.

З энтузіязмам мітынг сустрэў выступленне бельгійскага адваката Штэрмейлена, які расказаў сходу аб лондзінскім контр-працэсе і адзначыў геройскіх паводзіны Дзімітрава на Лейпцыгскім судзе.

БЯСЧЫНСТВЫ ЯПОНА-МАНЧЖУРСКІХ АТРАДАЎ НА СТАНЦЫІ ПАГРАНІЧНАЯ

ХАБАРАЎСК, 2. (БЕЛТА).

Генеральны консул СССР у Харбіне тав. Славуцкі звярнуўся з лістом да дыпломатычнага агента Манчжоў-го ў Харбіне Шы Люй-бэня, у якім патрабуе расследвання абурэчага свавольства япона-манчжурскіх улад на станцыі Пагранічная.

У ноч на 24 верасня 7 японскіх чыноў і 4 белагвардзейцаў з паліцэйскага пагранічнага атрада Манчжоў-го арабілі агідны вобыск у канторы Усурыйскай чыгункі.

Не выклікаўшы прадстаўнікоў канторы для прысутнасці ў часе вобыска, рабіўшымі вобыск былі самавольна ўскрыты сталы і шафы і прыведзены ў становішча хаоса дакументы і справы, якія там знаходзіліся. Рад дакументаў камерцыйнага характару быў унесен.

Тав. Славуцкі патрабуе прыняцця неадкладных мер да звароту ўнесеных дакументаў, а таксама настойвае на прыняцці сапраўдных крокаў да спынення свавольства і гвалтаў у адносінах совецкіх устаноў, якія праводзяцца япона-манчжурскімі і белагвардзейскімі агентамі пагранічнага атрада.

ЯПОНІЯ І ПАЗШ

ТОКІО. (БЕЛТА).

Усе газеты падкрэсліваюць, што Хірота заклапочан адшуканнем шляхоў палепшэння напружаных адносін паміж Японіяй і ПАЗШ.

Па думцы Хірота, паміж ПАЗШ і Японіяй няма супярэчнасцяй, якія-б перашкаджалі дружбе, і патаршэнне адносін паміж імі з'яўляецца толькі рэзультатам шанхайскага і манчжурскага інцыдэнтаў.

Хірота высоўвае стары план аб абмене «неафіцыяльнымі пасланнікамі паміж ПАЗШ і Японіяй» з мэтай садзейнічань «узаемнаму разуменню».

Газеты ўказваюць, што Хірота мае на ўвазе адправіць у ПАЗШ з неафіцыяльнай місіяй Сідэхара (былога міністра замежных спраў) або Мацуока (былы прадстаўнік у Лізе нацый) і хоча прысла ў Японію прафесара Молея (былы таварыш міністра замежных спраў ПАЗШ).

ПА СОВЕЦКІМ САЮЗЕ

КАЗАНЬ, 3. (БЕЛТА).

У 1934 годзе каля Казані пачынаецца пабудова гіганцкага вагона-будаўнічага завода. Завод будзе выпускаць 2 тысячы мяккіх і 2 тысячы цвёрдых вагонаў у год.

* * *

СВЕРДЛОЎСК, 3. (БЕЛТА).

На Верхня-Ісецкім заводзе імя Кабакова пушчана першая на магутнасці ў СССР 20-тонная электрапеч.

Яна будзе даваць 60 тон электратэхнічнай і трансфармацтарнай сталі. Выданы першыя 7.800 кгр. сталі.

* * *

ТЫФЛІС, 3. (БЕЛТА).

У першы дзень работы РыонГЭС пасля пуска дала 70 тысяч квт. гадзін энергіі. Бліскучая работа першага агрэгата пад прамысловай нагрузкай гаворыць аб высокай якасці абсталявання, падрыхтаванага палкам совецкімі заводамі.

ЗАРАЗ-ЖА ПЕРАБУДАВАЦЦА!

Праводзімае зараз абследванне Менскага гарсовета брыгадай **прэзідыума ЦВК СССР** і чыстка радоў ячэйкі выяўляе, што ў рабоце менскага гарсовета ёсць вельзарныя прарывы і недахопы.

Калі гарсовет XII-га склікання меў 685 членаў і кандыдатаў з ліку лепшых рабочых-ударнікаў Менска і, апрача таго, сотні добраахвотнага актыва з лепшай часткі рабочых і працоўных горада, дык зараз гарсовет мае ўсяго 659 членаў і кандыдатаў і актыў, які або працуе па кампаніях, або **часткова растрачан.**

Якія-ж прычыны пасіўнасці членаў і кандыдатаў гарсовета і яго актыва?

Першае і асноўнае ў рабоце гарсовета — гэта зацікавіць кожнага дэпутата ў такой пастаноўцы справы, каб кожны з іх бачыў рэзультаты свайго ўдзела ў рабоце гарсовета.

Гэтага такоўнага ў рабоце гарсовета няма. Секцыі арганізуюць брыгады, рэйды, буксіры, абследванні, а запытайце секцыянера, ці ведае ён, **што з гэтага вышла,** ён вам не адкажа. Нават бюро або старшыня бюро секцыі не адкажа пра ёс рэзультатаў работы секцыі.

Прынцыпу **добраахвотнасці** даўно ўжо няма ў рабоце секцый. Секцыянера перакідваюць з секцыі ў секцыю простай перастаноўкай яго картачкі, што, вядома, не ўмацняе працы, а ўносіць у яе рознабой і разброд.

Секцыі і дэпутацкія групы ў гарсовеце **абязлічаны.** Запытайце старшыню секцыі, ці рабіў ён па прэзідыуме справаздачу аб сваёй рабоце — чмяко на гэта пытанне не адкажа станоўча. Секцыі раздроблены. У кожнай з іх па 10-15 чалавек. Некаторыя секцыі ўжо некалькі месяцаў толькі лічацца ў справаздачах. У іх няма поўнага склада бюро, няма старшыні.

Слабая работа дэпутацкіх груп на заводах — вынік разрыва паміж кіраўніцтвам гарсовета прамысловасцю і працай дэпутацкіх груп.

Звычайна за секцыі і дэпутацкія групы на прэзідыуме робіць справаздачу зат. аргаддзела. Самаправерачных брыгад няма. Стварэцца канвеер пасаджэнняў, рэзалюцый, а праверкі людзей і спраў няма. Уліку работы секцыянераў па заданнях, праверкі выканання пастаноў як у аргаддзеле, так і ў секцыях няма, і гэта развівае пасіўнасць, самацёк, безрэзультатнасць і бескантрольнасць.

Барацьба з пасіўнасцю і бяздзейнасцю членаў гарсовета не вядзецца. З усіх дэпутатаў толькі 25-30 проц. прымае ўдзел у рабоце гарсовета. Да «мёртвых душ» гарсовет належных мер не прымае.

Трэба таксама адзначыць паяўнасць паўвяжкі планаў секцый з аддзеламі, з аргаддзелам і прэзідыумам. Секцыя складае план «с потолка», аддзел плана зусім не мае, а старшыня секцыі плана работы прэзідыума і «ў вочы не бачыў». Можна сабе ўявіць, што з такой работы атрымліваецца.

Што трэба зрабіць?

Неабходна зараз-жа з дапамогай актывістаў-членаў гарсовета правесці масавую праверку тых дэпутатаў, якія толькі лічацца на паперы, з мэтай выяўлення прычын пасіўнасці.

Праз друк («Звязда», «Рабочий» і г. д.) трэба выклікаць на работу непрацуючых. Даць прозвішчы тых, якія ўхіляюцца ад работы, ва ўсе пасцентазеты фабрык, заводаў і ўстаноў. З дапамогай фабкомаў і мясцкома паставіць пытанне на агульных сходах рабочых, паведамляючы прозвішчы непрацуючых членаў гарсовета. Аб членах партыі, якія ўхіляюцца ад працы ў гарсовеце, паведамляць партыйныя ячэйкі.

Усе гэтыя мерапрыемствы і рад іншых мотуць і павінны быць праведзены, як метад грамадскай уплейнасці на пасіўных членаў гарсовета. Мандатная камісія павінна зрабіць свае заключэнне і на шырокіх сходах рабочых паставіць пытанне аб выдзе са склада гарсовета непрацуючых.

Аргаддзел павінен так пристасаваць час сваіх заняткаў, каб рабочы пасля работы мог найсці ў гарсовет і атрымаць параду і дапамогу. Паўстае пытанне аб перасоўцы рабочага часу аргаддзела на 2 гадзіны, або аб дзяжурстве членаў бюро секцый у гарсовеце, бо ў 4-5 гадзін увечары рабочы ў гарсовеце знаходзіць толькі зачыненыя дзверы, а ў рабочы час ён прысці ў гарсовет не можа.

Колькасць секцый трэба скараціць, пераглядзець працаздольнасць бюро і старшынь.

Метад вярбоўкі актыва, які праводзіць Менгарсовет, невыстарчальны. Звычайна даручаецца члену гарсовета «завербаваць» на заводзе актыў. Трэба вярбоўку актыва праводзіць праз шырокія рабочыя сходы, каб вылучаны актывіст-секцыянер адчуваў адказнасць перад рабочым калектывам. Такі актыў будзе больш устойлівым, чым зараз.

Трэба спыніць колькасны справаздачнае «очковтирательство», а заняцца сапраўднай перабудовай метадаў і форм масавай работы, змацніць аргаддзел работнікамі і памятаць аб тым, што сіла і значэнне работы совета ў масе і што совет гэта не проста апарат, а гэта **апарат уцягнення мас рабочых і працоўных у кіраўніцтва сваёй пролетарскай дзяржавай.** І тыя задачы, якія стаяць зараз перад Менскім гарсоветам, ён зможа выканаць толькі з масамі і праз масы.

Лагуноў.

ВЕЧАР ПРОВАДУ ЖАНОРГАЎ І РЭДАКТАРОЎ ПАЛІТАДДЗЕЛЬСКІХ ГАЗЕТ

Учора ў Менску адбыўся вечар проваду новага пакалення большэвіцкіх радоў паліткаддзелаў МТС — жанарганізатараў і рэдактараў паліткаддзельскіх газет.

Вечар прайшоў пры шырокім удзеле гарадзкога партактыва, рабочых і работніц г. Менска. З вялікім і канкрэтным дакладам аб задачах паліткаддзелаў у даны перыяд, аб задачах жанарганізатараў і рэдактараў паліткаддзельскіх газет выступіў начальнік паліткастэкара Наркамзема БССР т. **Ратнек.**

На вечары прысутнічаў і выступіў з прамовай сакратар ЦК КП(б)Б т. **Шаранговіч.** Тав. Шаранговіча прысутныя сустрэлі працяжнымі апладысментамі. У сваіх прамовах т. т. Шаранговіч і Ратнек спыніліся на канкрэтных задачах барацьбы паліткаддзелаў за ажыццяўленне лозунга тав. Сталіна — «зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгасы — большэвіцкімі».

Жанарганізатараў і рэдактараў пітаў т. **Шулькін** — ад МенГК КП(б)Б, гарпрафсавета, т. **Белякоўская** ад бочых завода **імя Мясникова.** У адным слове т. **Белікіна** ад жанарганізатараў і т. **Булко** ад рэдактараў паліткаддзельскіх газет запаўнілі ЦК КП(б)Б, паліткастэкар Наркамзема БССР у тым, што пастаўленыя перад імі задачы гонарам будуць ажыццяўлены, што вы атрад большэвікоў у паліткаддзелах — жанарганізатары і рэдактары большэвіцку будуць змагацца за ажыццяўленне ўсіх дырэктыў партыі, сапраўды большэвіцкія калгасы, за зможнае калгаснае жыццё.

Жанарганізатары і рэдактары сустрэлі з удзельнікамі провадзу прывітальныя тэлеграмы: ЦК Усесаюзнай — т. **Сталіну,** паліткастэкару Наркамзема СССР — т. **Крыніцкаму,** ЦК КП — тав. **Гікало.**

VI усебеларускі розыгрыш па шахматах і шашках

У розыгрышы ўдзельнічае пераможца VI чэмпіяната СССР майстар Верлінскі

У першым туры **Верасаў** перамог майстра **Сіліча** (у ферзевым гамбіце). **Шалаеў,** граючы супроць **м. Мазеля,** дапусціў недакладнасць, праіграў пешку і ў далейшым маскоўскі майстар энергічнай ігрой з ахвярай ладзьі абвясціў мат у пяць ходаў. **Насцюшонак,** граючы супроць **Маневіча** трапіў пад атаку, страціў фігуру і праіграў. Праіграў і **Кейлес,** слаба абараняючыся супроць **Касперскага.** Закончылі ў нічыю **Гаві** і **Жудро.**

У другім туры **Верасаў** выйграў у **Кейлеса. Сіліч** супроць **Мазеля** ахвяраваў, з мэтай заперці ферзя, пешку, але камбінацыя была памылковай. Партыя магла-б прыйсці да нічыёй з лішняй для Мазеля пешкай, але ў апошні момант Сіліч яшчэ страціў «качество» і здаўся. **Гаві** супроць **Насцюшонка,** граючы чорнымі заблытаў ігру, трапіў у дрэнная становішча. Насцюшонак-жа не знайшоў лепшага працягу, праіграў «качество» і 2 пешкі і здаўся. Партыя **Шалаеў—Маневіч** закончылася нічыёй.

У трэцім туры гралі **Верасаў—Сташэўскі, м. Мазель—Кейлес, Маневіч—м. Сіліч, Гаві—Шалаеў, Жудро—Насцюшонак.** Хутка закончылася партыя **м. Мазель—Кейлес,** якая дала лёгкую перамогу маскоўскаму майстру, **Гаві** атрымаў лепшую партыю супроць **Шалаева,** але не зможаў рэалізаваць атрыманыя пераваг і перапішоўшы ў эндшпіль з рознакольернымі слонамі, скончыў у нічыю. **Верасаў** атакаваў **Сташэўскага,** але дапусціў недагляд і адклаў партыю ў прайгрышным для слабе становішчы (заадным эндшпіль без двух пешак).

2-га, увечары іграўся чацверты майстар **Верлінскі—Насцюшонак, Мазель—Сташэўскі, Касперскі—Верасаў, Жудро—Шалаеў, Гаві** — майстар **Сіліч—Кейлес—Маневіч.** Хутка закончылася эфектнай камбінацыяй з ахвяраваннем слана ў дзёбоце ферзевых пешак партыя майстар—**Верлінскі—Насцюшонак.** **Сташэўскі** праіграў шматходовую партыю майстру **Мазелю.** Майстар **Сіліч** праіграў **Гаві.** Першую нічыю зрабілі **Кейлес** супроць **Маневіча.** Нічыёй закончыліся сустрэчы **Верасаў—Касперскі, Шалаеў—Жудро.**

Учора зранку даігрывалася шаргая партыя тура **Сташэўскі**—майстар **Верлінскі. Сташэўскі** атрымаў добрую партыю, але заблытаў ігру. Выйграў пешку... але праіграў фігуру. У далейшым Верлінскі энергічнай ігрой праіграў яшчэ адну фігуру і прыйшоў Сташэўскага на 28-м ходзе здаўшы. Увечары іграўся пяты тур: **м. Мазель—Касперскі, Верасаў**—майстар **Верлінскі, Жудро**—майстар **Сіліч, Гаві—Кейлес, Маневіч—Сташэўскі і Насцюшонак—Шалаеў.**

Пасля чатырох тураў лідуе наперадзе: майстар **Мазель** (+3 з 4), за ім **Гаві** (+3 з 4), **Верасаў** і **Маневіч** (па +2½ з 4).

Сёння зранку даігрываюцца партыі. Увечары—шосты тур. Найбольш цікавыя сустрэчы—майстар **Верлінскі—Жудро, Верасаў—м. Мазель,** майстар **Верлінскі—Шалаеў** і **Касперскі—Маневіч.**

Л.

ДЗЯРЖЦЫРК Пачатак у 8 г. 30 м.
СУСВЕТНЫ АТРАКЦЫЁН
Берберыйскія Веліканы ЛЬВЫ
1-ы раз ЛЕЎ на КАНІ
Популярн. усмірыцель Б. ЭДЭР.
Бр. ГАВАРАШЫЯ—сатырыкі.
Японская трупа—АСІЯМА І КАЦУЦІ
5 ЭРЦАНІ. Музычныя эксцентр.
І яшчэ 10 розных нумароў.

ЕДЗЕ КІО ЕДЗЕ

„Чырвоная Зорка" Каса—ад 1 г. дня. Новая совецкая камедыя Сапраўдны каўказец у 9 частках

Кіно Інтэрнацыянал КВЕТКА КАХАННЯ

Кіно „Пролетарый" Стальны чалавек 1-я серыя ў 7 частках

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр „ЗЛАТЫЯ ГОРЫ" Мастацкі гукавы кіно-фільм

„СПАРТАК" Каса з 4 г. дня. Выдатны ўсходні фільм АБРЭК ЗАУР

Аднагадовыя педкурсы па падрыхтоўцы настаўнікаў і канцэнтра

для школ г. Менска і Менскага раёна адкрываюцца ў г. Менску пры гарАНО.

На курсы прымаюцца асобы, маючыя асвету за сем гадоў, ва ўзросце ад 16 з пал. год.

Прынятыя забяспечваюцца стыпендыяй ад 25 да 50 руб. у месяц, у залежнасці ад паспяховасці, а прыезжыя кватэрнымі да 15 руб. у месяц. Курсанты карыстаюцца наступнікай сталоўкай і забяспечваюцца прадуктамі ва ўзроўні з настаўнікамі.

Да заявы прыкладаюцца дакументы аб асвеце, асвеце, саістановішчы бацькоў і анкеты заверэную РВК, або сельсаветам.

Заявы накіроўваць па адрасу: Менск, Камунальная 32, школа № 13, заг. педкурсамі. Справкі аб прыёме школьнікаў у камунлярні школы ад 12 да 4-х гадзін.

Прыём заяў да 5-га кастрычніка г. г.

Загадчык педкурсаў ЗЯНЬКЕВІЧ.

КІО ЕДЗЕ

Рэспубліканская тэрытарыяльная каса сацстраха БССР, гарадскія і раённыя страхкасы

Ў адпаведнасці з пастановай СНК СССР і УсесЦСПС ад 10-IX-33 г. і пастановай СНК БССР і ЦСПСБ ад 16-IX-33 г., як юрыдычных арганізацый

спынілі сваю дзейнасць

з перадачай усіх функцый прафсаюзам.

Бягучыя рахункі б. тэрытарыяльных кас з захаваннем старой нумарацыі з 25 верасня перайменаваны ў бягучыя рахункі адпаведных саветаў прафесіянальных саюзаў (ЦСПСБ, гарпрафсовета, райпрафсовета).

Усе установы і асобы, маючыя пратэнзіі да б. тэрытарыяльных страхавых кас, за выключэннем разлікаў па узносах на сацыяльнае страхаванне, павінны прадставіць **не пазней 10 кастрычніка 1933 г.,** пасля чаго ніякія пратэнзіі прымацца не будуць.

Ліквідком рэспубліканскай касы сацстраха знаходзіцца ў памяшканні ЦСПСБ, а гаррайстрахкасы—у гаррайпрафсоветах.

ЦСПСБ.

У сувязі з рэарганізацыяй справы сацыяльнага страхавання на вытворча-галіннаму прынцыпу і стварэннем у прафсаюзах галінных кас сацыяльнага страхавання

з 1-га кастрычніка 1933 г. усе страхавальцы павінны ўносіць страхавыя ўзносы

на БЯГУЧЫЯ РАХУНКІ АРГАНІЗОВАНЫХ НАСТУПНЫХ ГАЛІННЫХ КАС

1. Торф-слюдзяная прамысловасць № 5003
2. Агульнае машынабудаўніцтва № 5007
3. Сельгасмашынабудаўніцтва № 5009
4. Электра-тэхн. прамысловасць № 5011
5. Асноўная хімія № 5012
6. Шкло-фарфар № 5014
7. Цэментна-керамічная прамысловасць № 5015
8. Лесасплаў № 5016
9. Дрэваапрацоўка № 5017
10. Друкары № 5018
11. Паперкі № 5019
12. Бавоўняна-папяровая прамысловасць № 5020
13. Шарсцянікі № 5021
14. Льнапеньканджут № 5021
15. Скурнікі № 5023
16. Шкіранікі № 5024
17. Мука хлебн. кандытарская № 5026
18. Рыбная прамысловасць № 5027
19. Мяса кансервовая прамысловасць 5028
20. Сельгрупрам № 5029
21. Прам жыллёва-каапер будаўніцтва № 5030
22. Шофераў і авія-работнікі № 5031
23. Нарсувязі № 5032
24. Камунальнікі № 5033
25. Гор. прадпрыемстваў дамработнікі № 5034
26. Дзяржгандаль і кааперацыі № 5035
27. Грамадскае харчаванне № 5036
28. Працасветы № 5037
29. Медсанпрацы № 5038
30. Саюз працмастацтва № 5039
31. Дзяржустановы № 5040
32. Фін-банк. работнікі № 5041
33. Зямляроб. саўгасы № 5042
34. Жывёлагад. саўгасы № 5043
35. МТС і батрацтва № 5044
36. Чыгдарбуд № 5045

ЦСПСБ.

МЕНСКІ ГАРФІНАДДЗЕЛ

паведамляе ўсіх платнікаў страхавых плацяжоў г. Менска, што плацежныя паведамленні аб уплаце страхавых плацяжоў па 1934 г. Гарфінаддзелам разасланы.

Тэрмін уплаты страхавых плацяжоў 15-га кастрычніка 1933 г.

Неатрымаўшыя паведамленняў абавязаны з'явіцца ў Гарфа (Карла Маркса 14, першы паверх, пакой № 6) за іх атрыманнем да 10 кастрычніка 1933 г.

Пры неуплаце страхавых плацяжоў у вызначаны тэрмін налічаныя сумы будуць спаганяцца ў прымусовым парадку з налічэннем пені.

МЕНГАРФІНАДДЗЕЛ.

ЕДЗЕ КІО ЕДЗЕ

КУРСЫ ВОСУ

арганізуюць 5-месячную групу БУХІ АЛЬТАРАЎ

для працы на раёне ў сістэме Белгандля. Стыпендыя ад 100 да 150 руб. і кватэрных 25 руб. у месяц. Інтэрнатам курсанты не забяспечваюцца. Прымаюцца бухгальтары, пам., бухі або рахункаводы не менш як з 2-гадовым рахунковым стажам па падвойнай сістэме. Заявы з дакумантамі: аб сацстановішчы і паходжанні, аб адукацыі (не менш 7 груп), аб узросце (не менш 18 год.), аб адносінах да вайсковай павіннасці, аб стажы і аб вызваленні ад арошнага месца працы прымаюцца ў канцылярыі ВОСУ (Менск, комуністычная, 16, пакой 10) да 12 кастрычніка ад 9 да 12 гадзін дня. Заявы без усіх пералічаных дакумантаў разглядацца не будуць.

РОБІНГУД

Наступныя настаўнікі,

скончыўшыя педінстытуты і педтэхнікумы, былі накіраваны НКАсветы ў раён, але на працу не з'явіліся: Грушэўскія, Юрэвіч—скончылі маталеўскі пединстытут. Бэвіс—скончыла БПУ. Гарамейская, Барысенка, Стодола—скончылі менскі пединстытут. Бура—скончыла гомельскі пединстытут. Ангайберг, Рохчина, Грановіч, Губін, Кузьма, Лушыц, Мякакоў, Лісоўская, Ясевіч—скончылі барысаўскі педтэхнікум. Гэтых таварышоў лічыць дэзэртырамі з адказнага участка працы. Просьба да арганізацый, якім адома месца працы памянёных т.т., паведаміць НКАсвет БССР і зклікаўскі райана, адначасова заявіць з працы як дэзэртыраў.

РОБІНГУД

Бел. трэст АБШ АДВЯШЧА